№ 30 (580) 14 жніўня 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## Стрымаць Расею магчыма

калі Захад вернецца да маральных прынцыпаў замежнай палітыкі ў рэгіёне. Піша Віталь Сіліцкі.

Старонка 3

## Dura lex

Кнігі галоўнейшыя за прэзыдэнтаў.

Старонка 5

## Арабскія праекты разбудовы Менску

Кірава, Купалы, Кісялёва, Чырвонаармейская...

Старонка 8

### У НУМАРЫ

**Урок гісторыі Беларусі**

1:0 З такім лікам блiскучы БАТЭ перамог у Сафіі мясцовы «Леўскі». Цяпер беларускай камандзе рукой падаць да Лігі чэмпіёнаў! Цікава, што напярэдадні матчу прэзыдэнт «Леўскага» выхваляўся, што найлепшы клюб сталіцы краіны з 1400-гадовай гісторыяй лёгка выйграе ў заводзкай каманды з правінцыйнага гораду «штучна ўтворанай дзяржавы».

**Батанічны сад**

Пакуль мама «будзе нюхаць кветкі», чаму б бацьку з сынам і сябрамі не адпачыць па поўнай праграме? Піша Віталь Тарас. **Старонка 6.**

**Ёсьць горад, перанасычаны беларускім жыцьцём**

Гэта Варшава. Гутарка з налібоцкім варшавяком Зьмітром Гурневічам. **Старонка 12.**

**Узьлёт і падзеньне «сацыялізму з чалавечым тварам»**

20 жніўня спаўняецца сорак гадоў уводу войскаў краінаў Варшаўскай дамовы ў Чэхаславаччыну. Піша Вацлаў Шаблінскі. **Старонка 13.**

**Калі Дзень археоляга?**

Піша Лявон Калядзінскі. **Старонка 10.**

**Рудкоўскі ў Гомелі**

**22 жніўня а 18.00 у Гомелі на сядзібе Ўправы АГП (вул. Палеская, 52)** адбудзецца творчая вечарына філёзафа і багаслова Пятра Рудкоўскага. Ён прывязе таксама выставу новых кніг і часопісаў. Запрашаем усіх.

# Як лёгка пачацца сусьветнай вайне



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Вайна ў Грузіі: факты, камэнтары, наступствы для Беларусі. Старонкі 2–4. На фота: Грузінскі горад Горы пасьля расейскіх бамбёжак.**

SVERIGES AMBASSAD

Пасольства Швэцыі
Рэспубліка Беларусь

**Швэдзкае пасольства ў Менску шукае супрацоўнікаў**

Швэцыя адкрывае сваё пасольства ў Беларусі і ўвосень мае намер распачаць падбор мясцовага пэрсаналу. Адкрыцьцё пасольства заплянавана на зіму, таму непасрэдна набор супрацоўнікаў будзе ажыцьцяўляцца ў канцы 2008 — пачатку 2009 г.

Больш інфармацыі пра ўмовы і працэдуру пошуку супрацоўнікаў можна атрымаць на хатняй старонцы Адзьдзяленьня пасольства Швэцыі ў Менску — www.sweden.by

## «Грузія стварыла найлепшае войска на постсавецкай прасторы»

Як ёй гэта ўдалося за чатыры гады? Піша расейскі вайсковы аглядальнік Павал Фэльгенгаўэр.

З грузінаў як ваякаў пасьля іхных паразаў у 1992 г. часта сьмяюцца. У жніўні 1992-га войскі дзяржрады, якая кіравала тады ў Тбілісі, увარваліся ў Абхазію. Зрэшты, называць іх «войскамі» — зашмат гонару. Гэта былі, найхутчэй, бандфармаваньні ў найгоршым значэньні гэтага слова: баевікі з арганізацыі «Мхедрыёні» вядомага злодзея ў законе Джабы Яселіяні і «нацыянальная гвардыя» Тэнгіза Кітавані.

Ня толькі ў Паўднёвай Асэтыі і ў Абхазіі, але ва ўсёй Грузіі баевікоў «Мхедрыёні» і іншую ўзброеную шушамець пачатку 1990-х узгадваюць зь нянавісьцю. Яселіяні пазьней памёр у Тбілісі пры цьмяных абставінах, а Кітавані жыве сабе, валодае рэстарацыяй у Маскве, дзе расейскія ўлады далі яму палітычны прытулак.

**Працяг на старонцы 4.**



АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

## Be Free

Чуткі пра ўзмоцнены памежны кантроль на шляху ў Львоў ня спраўдзіліся. Мо гэта і ўскружыла галаву таму-сяму з музыкаў… Выснова начной дарогі ў аўтобусе — лепш ня ведаць тых, чые песьні слухаеш.

**Працяг на старонцы 11.**

КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ

# Масква і «нашае гора»

Піша Аляксандар Класкоўскі.

Расейскі пасол Сурыкаў на прэсавай канфэрэнцыі 12 жніўня зрабіў Беларусі вымову, што не пасьпяшалася падтрымаць ўварваньне ў Грузію. Маўчаньне Менску на гэты конт дыплямат назваў «вельмі незразумелым».

Як сказаў Сурыкаў, у выпадку «зьяўленьня непрыемнасьцяў у Беларусі мы вашае гора заўжды падзяляем у міжнародных арганізацыях». Маўляў, Расея заўжды выступала супраць эканамічных санкцый у дачыненьні да Беларусі, абараняла пазыцыю рэспублікі пры абмеркаваньні сытуацыі з правамі чалавека.

Калі цалкам адкінуць рэшткі дыпляматычнае мовы, то сэнс такі: мы вашае начальства выгароджвалі за парушэньні правоў чалавека, а вы, няўдзячныя, ня рвецеся зараз ухваляць нашую каўкаскую вайну!

Дарэчы, Каўказам справа можа ня скончыцца. Масква рэзка ўзмацніла ваяўнічую рыторыку ў дачыненьні да Кіева. Заўтра ад Беларусі могуць запатрабаваць, каб падтрымала прэтэнзіі на Севастопаль, на Крым.

Нас упарта ўцягваюць у маскоўскія «разборкі» з былымі «малодшымі сёстрамі».

Дзякуй, але сваю постымпэрскую кашу сёрбайце, панове, самі!



# Першыя мэдалі

Першы мэдаль нашы зарабілі ў ня самым прыгожым спорце — у цяжкай атлетыцы сярод жанчынаў. Грузы насіць нашыя кабеты звыклыя. У вагавай катэгорыі 53 кг нашае суайчыньніца стала бронзавым прызёрам Пэкінскай алімпіяды. У суме двухбор'я 26-гадовая Настасься Новікава з Жодзіна набрала 213 кг (95 кг — рывок плюс 118 кг — штуршок).

Залаты мэдаль атрымала прадстаўніца Тайлянду Джараэнраттанатаракун Прапавадзі (221 кг (95 плюс 126)), а срэбра — Юн Джынхі з Паўднёвай Карэі. Яна паказала такі ж вынік, што і беларуска, але стала другой, бо сама важыць меней.

24-гадовы мянчук Міхаіл Сямёнаў стаў другім беларускім мэдалістам на Алімпіядзе ў Пэкіне. «Бронзу» Міхаіл заваяваў у грэка-рымскай барацьбе ў катэгорыі да 66 кілаграмаў. Барэц выйшаў у чвэрцьфінал, дзе прайграў французу Стыву Гено, які пазьней стане алімпійскім чэмпіёнам. Менавіта гэтая акалічнасьць дазволіла беларусу пазмагацца за бронзавы мэдаль. У роўнай барацьбе з супернікам з Казахстану Сямёнаву пашанцавала болей падчас лёсаваньня. Адзінае, што заставалася зрабіць беларусу — гэта не прапусьціць сілавы прыём у апошнія трыццаць сэкундаў. І наш асілак з гэтым справіўся. Ёсьць яшчэ адзін мэдаль!

З грэка-рымлянаў Беларусь будзе прадстаўляць яшчэ Сяргей Арцюхін у вагавай катэгорыі да 120 кілаграмаў.

# Таксама наш

Бронзавым прызёрам Алімпіяды ў спартовай гімнастыцы ў складзе зборнай ЗША стаў ураджэнец Менску Аляксандар Арцём'еў. Менавіта практыкаваньне Арцём'ева на кані стала адным з вырашальных у посьпеху амэрыканцаў, хаця каманда ляцела ў Кітай у статусе аўтсайдэра.

Гімнаст патрапіў у выязны склад зборнай у апошнюю хвіліну, калі праз траўму лыткі на Алімпіяду ня змог паехаць Морган Хэм — брат-блізьнюк алімпійскага чэмпіёну Афінаў Пола Хэма.

Арцём'еў нарадзіўся ў 1985 годзе ў сталіцы Беларусі, а ягоны бацька Ўладзімер Арцём'еў — чэмпіён СССР па спартовай гімнастыцы ў шматборстве. Пераехаў зь сям'ёй у ЗША ў 1994 годзе, а ў 2002 атрымаў грамадзянства. Цяпер ён жыве ў Дэнвэры, штат Калярада. Вось так мы трацім генафонд.

У 2006 г. Арцём'еў заваяваў бронзу на чэмпіянаце ў практыкаваньнях на кані, якая стала першай для каманды ЗША ад 1979 г.

«Я зьдзейсьніў мару свайго жыцьця. Гэтай ноччу я буду спаць з мэдалём. Ужо сам выхад нашай каманды на Алімпіяду быў посьпехам, а цяпер мы вернемся ў Амэрыку героямі», — сказаў шчасьлівы прызёр.

**ЗП**



# Кітайскі падман

Адна дзяўчынка сьпявала, а другая толькі разяўляла рот. Бо сьпявачка здалася члену Палітбюро крывазубай.

Дзяўчыначка, што сьпявала на адкрыцьці Алімпійскіх гульняў, насамрэч толькі варушыла вуснамі. Сапраўдную 7-гадовую сьпявачку палічылі недастаткова прывабнай.

Фота мілае 9-гадовае Лін Мяоке ў чырвонай сукеначцы абляцелі цэлы сьвет. Лін прасьпявала на цырымоніі «Оду Айчыне», калі заносілі кітайскі сьцяг. Гэта была кульмінацыя шыкоўнае цырымоніі.

Аднак той выступ быў фальсыфікацыяй, прызнаўся прадусар спэктаклю. Лін толькі варушыла вуснамі, а сьпявала 7-гадовая Ян Пэй — з анёльскім галаском, але, як на густ камуністычнага кіраўніцтва, занадта пульхная і крывазубая.

Рашэньне аб падмене прыняў член палітбюро Кампартыі Кітаю, адказны за сцэнар цырымоніі, пасьля генэральнага прагону.

Такая дыктатура карцінкі выклікала сёньня буру дыскусій на форумах. Людзей зачапіла і тое, што фаервэркі на тэлетрансьляцыі аказаліся... кампутарнымі эфэктамі. «Гэта праўда, што з прычыны кепскай бачнасьці ў начы частка паказу фаервэрку была кампутарна згенэраваная. Жывыя здымкі іх былі б немагчымыя. Мы не маглі пайсьці на рызыку і пасьлаць верталёт над трасай салютаў», — прызнаў у інтэрвію газэце «Бэйджын таймз» адзін э экспэртаў Алімпійскага камітэту.

Калі маніпуляцыя зь дзяўчаткамі — гэта бадай перажытак старых уяўленьняў аб прыгожым, то падмена жывой рэчаіснасьці кампутарнай — навейшы фальш. Але ж... прыкра.

**МБ**



**Фоты мілае 9-гадовае Лін Мяоке ў чырвонай сукеначцы абляцелі цэлы сьвет.**



**Ян Пэй камуністычнаму кіраўніцтву падалася крывазубай.**

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная. Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз т.:
(017) 284–73–29,
(029) 260–78–32,
(029) 618–54–84

СЬЦІСЛА

### «Беларускі народ, як і ўсе расіяне»

А.Лукашэнка ад імя беларускага народу і сябе асабіста даслаў спачуваньні прэзыдэнту Мядзьведзеву: «Беларускі народ, як і ўсе расіяне, смуткуе аб ахвярах трагедыі, суперажывае людзям, якія страцілі сваіх блізкіх, засталіся без прытулку і сродкаў да існаваньня. Мы зычым ім стойкасьці і мужнасьці ў пераадоленьні наступстваў гэтай гуманітарнай катастрофы». Адначасова высокапастаўлены, але ананімны чыноўнік МЗС заверыў расейскае агенцтва «Інтэрфакс», што «ў Беларусі не выклікае сумневу ... правамернасць дзеяньняў Расеі па абароне сваіх грамадзянаў на тэрыторыі Паўднёвай Асэтыі». Абедзьве заявы зьявіліся на наступны дзень пасьля гнеўнай інвэктывы расейскага пасла Сурыкава на адсутнасьць рэакцыі на канфлікт зь беларускага боку.

### Злодзеі пабілі вітраж Шагала

Знакаміты вітраж сабору ў Мэтцы (Францыя), расьпісаны Маркам Шагалам у 1983 г., пашкоджаны злодзеямі. Каб залезьці ў сабор, яны прабілі ў вітражы дзірку 65 на 35 см і скралі нейкую драбязу. Рэстаўравацць унікальны вітраж будуць за дзяржаўны кошт.

### Праверкі на мяжы перад фэстам у Нарвілішках

Дадатковыя меры памежнай бясьпекі будуць прынятыя беларускімі і літоўскімі памежнікамі на час фэстывалю Be2gether («Будзем разам»). Ён адбудзецца 14—17 жніўня каля сьцэнаў Нарвіліскага замку ў непасрэднай блізкасьці ад мяжы зь Беларусьсю.

### «Свабодны тэатар» быў у Чэхіі

11 жніўня беларускі «Свабодны тэатар» вярнуўся з чэскага Градэчка — месца, дзе 30 гадоў праходзяць тэатральныя сустрэчы. Дамы ля Татраў, у лесе, дзе праходзяць сустрэчы, належаць Вацлаву Гаўлу і ягонаму сябру, рэжысёру Андрэю Кроўбу. Ад 1970-х, калі ў Чэхаславаччыне лютавала камуністычная дыктатура, Кроўб і Гавал зьбіраюць у сябе ў гасьцях пад выглядам адпачынку свабодалюбных дзеячаў культуры.

### Два новыя гарады

Крынкі (Сакольскі павет) і Міхалова (Беластоцкі павет, абодва — беларуска-польскае Падляшша) стануць гарадамі. Рада міністраў Польшчы прыняла такое рашэньне. Войты гмінаў цешацца. Прэстыжна лічыцца гараджанамі.

### ARCHE ў Горадні

**28 жніўня а 18.30 у Горадні на офісе ТБШ (вул.Будзённага, 48а)** пройдзе прэзэнтацыя спэцыяльнага нумару часопісу ARCHE, прысьвечанага Другой сусьветнай вайне. Удзел бяруць рэдактар часопісу Валер Булгакаў і журналіст Андрэй Пачобут.

# Як стрымаць Расею?

Чым кіраваўся Саакашвілі, рушыўшы войскі на Цхінвалі? Няўжо ўсур'ёз лічыў, што Расея не зрэагуе? На што быў разьлік? Піша **Барыс Тумар**.

Ці мог Саакашвілі аддаць войскам загад пра атаку, не паставіўшы ў вядомасьць ЗША? Гэта малаімаверна, улічваючы асаблівыя адносіны Тбілісі і ЗША. Знакаміты рэпарцёр Войцех Ягельскі піша з Тбілісі, што плян удару быў распрацаваны прынамсі год таму. Нават калі з Вашынгтонам гэта не ўзгаднялася, цяжка сабе ўявіць, каб амэрыканская выведка таго ня ведала. У такім разе маўклівая падтрымка рэйду ў Асэтыі кладзецца ў агульную канву саманадзейнае замежнай палітыкі адміністрацыі Буша. Вынік гэтай палітыкі — стабільна 100—150-даляравыя цэны на нафту і 50 тысяч ахвяраў у Іраку.

Ці была правакацыя Расеі? Ясна, што **150 танкаў проста так на мяжы напагатове не стаяць**. Можна заўважыць, што напярэдадні канфлікту ў Цхінвалі зьехаліся журналісты практычна ўсіх расейскіх СМІ і з Цхінвалі вывезьлі дзяцей. Але мастацтва палітыка ў тым і праяўляецца, каб не паддавацца на правакацыі. Аўстрыйская журналістка Крысьціна Курчаб-Рэдліх, якая доўгі час была карэспандэнткай у Чачэніі, з тонкім веданьнем кулісаў каўкаскае палітыкі і яе працягаў іншымі сродкамі, адзначае: тую самую тактыку Пуцін ужываў для атак на чачэнцаў — падштурхнуць праціўніка да памылак і скарыстаць іх як падставу.

Чаго хацелі дабіцца грузіны? Яны хацелі справакаваць паніку сваім масіраваным ударам па асэтынскіх пазыцыях і з налёту ўзяць усё. Той факт, што яны не перакрылі Рокскага тунэлю наводзіць на думку, што яны сапраўды правакавалі масавыя ўцёкі асэтынскага насельніцтва і перадусім вайскоўцаў, каб пачаць гандаль постфактум.

Ці сапраўды Цхінвалі сьцёрты з твару зямлі і ў ім загінула 2000 мірных жыхароў? Расійскія спэцслужбы спрабуюць зрабіць зраюіць кальку з асьвятленьня югаслаўскіх войнаў. Здаецца, расейская прапаганда нямала маніць, перабольшваючы адны і зьмяншаючы іншыя лічбы.

Чаго дабілася Грузія сваёй авантурай? Грузіны паказалі, што яны ня нацыя баязьліўцаў, што ўмеюць ваяваць, калі маюць зброю. Таксама яны паказалі, **як хутка можа зьмяніць краіну перабудова краіны на эўрапейскі лад**, бо яшчэ пяць гадоў таму Грузія была недадзяржавай. Яны паказалі асэтынам, што тым ня жыць спакойна ў сваіх цясьнінах бязь міру з Тбілісі. Але гадоў на 20, на пэрыяд памяці пакаленьня, Грузія страціла магчымасьць памірыцца з асэтынамі, вярнуць Асэтыю.

Калі Тбілісі хацеў такім чынам сарваць шырму з пазыцыі Расеі і справакаваць Маскву на ўвод войскаў, ён свайго дабіўся.

Саакашвілі мог кіравацца тым, што Асэтыя сыходзіла без варыянтаў, і важна было б хоць паказаць, што гэта расійская акупацыя, а ніякі там нацыянальны канфлікт. Толькі раней ён меў у Цхінвалі 500 расейскіх вайскоўцаў, якіх Грузія была здольная заблякаваць і ізаляваць на працягу некалькіх гадзінаў, як тое і зрабіла 8 жніўня, а зараз будзе мець цэлую 58-ю армію.

Ці ведала Расея пра рэйд загадзя? Выглядае, што так, але вычэквала. Міністар замежных справаў Швэцыі параўнаў дзеяньні Расеі з тактыкай Гітлера, які таксама ўмела выкарыстоўваў абарону «суайчыньнікаў» як падставу для ўмяшаньня ва ўнутраныя справы суседзяў, а пасьля і для поўнага падпарадкаваньня іх, і ўсё гэта пры поўным нежаданьні заходніх дэмакратый умешвацца ў няясныя ўсходнія справы.

Бамбавікі над Марнэулі выклікалі злавесныя ўспаміны ў Хэльсынкі і Рызе і дрыжыкі ў Кіеве.

Пачвары вылезьлі з скрынкі Пандоры, і тая скрынка называлася Косава, і адкрыў яе Джордж Буш. Калі Амэрыцы можна адарваць Косава ад сувэрэннай дзяржавы, то чаму Расеі няможна зрабіць тое самае з Асэтыяй? Так, у Косаве альбанцаў было 90%, а ў Асэтыі асэтынаў дзьве трэціны. Так, Косава было спэцыяльным выпадкам, але Косава можа аказацца і прэцэдэнтам.

Якое магло б быць выйсьце з сытуацыі? Вельмі простым: Тбілісі наступае на горла ўласнай песьні, **прызнае незалежнасьць Асэтыі і Абхазіі**, абтрасае гэтыя ланцугі, якія замінаюць Грузіі далучыцца да НАТО і Эўрасаюзу. Пад парасонам НАТО і ЭС Грузія набыла б гарантыі сувэрэнітэту. Нічога фатальнага ў такой страце для Грузіі не было б. Затое Расея страціла б падставы для ўмяшаньня.

Ці рэальны такі варыянт? Не, не рэальны пасьля таго што што адбылося, калі ў Грузіі нагнеценыя ірэдэнтысцкія настроі. Зь іншага боку, так, рэальны — а чаму б не прызнаць рэчаіснасьць рэчаіснасьцю? — толькі не пры гэтым пакаленьні палітыкаў. Патрэбная іншая палітычная воля і інтэлектуальная прызма.

Якая навука для Беларусі? Першае — беларуская дыпляматыя даказала сваю здольнасьць да апэратыўнага рэагаваньня, ад пачатку заняўшы нэўтральную пазыцыю. Другое — магчымасьць атрыманьня падвойнага грамадзянства імплікуе стратэгічныя рызыкі для суседзяў Расеі. Трэцяе — Расея перайшла на новую стадыю імпэрыялізму, на якой гатовая да больш актыўнага ўжыцьця ваеннай сілы для прасоўваньня сваіх эканамічных інтарэсаў. Калі сёньня ў Горы і Цхінвалі, то чаму заўтра ня ў Крыме, а пазаўтра ня ўздоўж «Ямалу-Эўропы»? Чацьвёртае, крывавая сутычка на мікраскапічным лапіку нагадала, што чалавецтва можа лёгка скаціцца да новага сусьветнага канфлікту, і з ростам эканамічнай магутнасьці Расіі яе палітычныя прэтэнзіі і псыхалягічныя траўмы ствараюць для таго падставы. Асэтынская вайна паказала **неабходнасьць далейшае распрацоўкі дактрыны нэўтралітэту Беларусі**.

# Стрымаць Расею магчыма

калі Захад вернецца да маральных прынцыпаў замежнай палітыкі ў рэгіёне. Піша **Віталь Сіліцкі**.

Грузіна-расейская вайна які раз засьведчыла, што сучасныя войны — гэта найперш інфармацыйныя мерапрыемствы, дзе перамогу здабываюць ня толькі на полі бою, але і ў віртуальнай прасторы.

Аднак віртуальныя войны мусяць узьдзейнічаць ня толькі на падсьвядомасьць, але і на розум. У сёньняшняй вайне трэба ня толькі забіць мэдыяканалы сваёй карцінкай ці страшылкамі, але навязаць уласнае вызначэньне зла, якое трэба пакараць, і дабра, за якое варта праліць кроў. Адначасова са стрэламі гарматаў і мэдыйнымі войнамі (у якіх адна і тая ж карцінка можа агучвацца ваюючымі бакамі як доказ злачынстваў праціўніка), такія войны ідуць у фармаце судовых спрэчак, дзе кожны бок, спасылаючыся на прэцэдэнты, імкнецца прыдаць законнасьць і легітымнасьць уласным дзеяньням. Да таго ж чым больш такіх спасылак, тым менш надзеяў на тое, што нормы міжнароднага права і элемэнтарнай маралі яшчэ маюць хоць нейкае значэньне і карысьць для прадухіленьня ці вырашэньня такіх канфліктаў.

Для апраўданьня сваіх паводзінаў у Паўднёвай Асэтыі Грузія фактычна скарыстала расейскую апэрацыю па «навядзеньні канстытуцыйнага ладу» ў Чачэніі. Нават улічваючы тое, што лічбы пра тысячы ахвяраў — яўнае перабольшваньне (аб гэтым пазьней), дзеяньні грузінскіх вайскоўцаў (глядзіце аналіз «НН» уверсе гэтай старонкі) бясспрэчна цягнулі на этнічныя чысткі.

У той жа час, абвінавачваньні Саакашвілі ў генацыдзе можна ўспрымаць адкуль заўгодна, але ня з боку расейцаў. Бо калі хочаце пабачыць Мішу ў Гаазе, то, даруйце, толькі разам з усім Крамлём — за рэальны, а не мэдыйны, генацыд у Чачэніі. На жаль, непакараныя злачынствы ствараюць доўгатэрміновую праблему, нашмат глыбейшую за іх саміх — наступнага злачынцу пакараць нашмат цяжэй. Гітлер таксама думаў, што генацыд габрэяў яму сыдзе з рук як туркам — генацыд армянаў...

Для Расеі ж умяшальніцтва ў вайну было асьвячана як змаганьне з генацыдам і этнічнымі чысткамі — толькі так можна было дамагчыся галоўнай мэты гэтага канфлікту, які насьпяваў ужо некалькі месяцаў, пасьля таго як Паўднёвая Асэтыя папрасілася ў склад Расеі, а Дума заклікала яе просьбу задаволіць. Нагадаем, што ЗША і большая частка ЭС даказвалі, што выпадак Косава ня можа стаць прэцэдэнтам у міжнародным праве, бо там была пагроза генацыду мясцовага насельніцтва і этнічных чыстак. Што прыдумалі? Стварыць карцінку генацыду ў Цхінвалі. Выйшла даволі непрафэсійна — хіба толькі «вызваленьне» гораду 58-й арміяй давяло колькасьць руінаў да патрэбнай для мэдыяпрапаганды. Затое, ляўры Буша-вызваліцеля для гаспадароў Крамлю паказаліся дробнымі, і Мядзьведзеў пачаў гуляць ужо ў Чэрчыля і заклікаць Захад да ўстрыманьня ад «уміратварэньня агрэсара» — акурат у той час, як расейская авіяцыя працягвала бамбёжку грузінскай тэрыторыі, а абхаскія марыянэткі, хаваючыся за танкамі расейскіх



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Кіраўнік МЗС Францыі Бэрнар Кушнер (зьлева) і прэзыдэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі ў Горы.**

дэсантнікаў, адкрылі другі фронт.

Калі нормы маралі і міжнароднага права перакручваюцца і выкарыстоўваюцца для апраўданьня злачынстваў і агрэсіі — вінаватыя ня толькі тыя, хто гэта робіць, але і тыя, хто гэтаму не пярэчыць. Заходнія дэмакратыі, як шмат разоў у гісторыі, ізноў паплаціліся за тое, што прамянялі нормы права і маралі на цынічную realpolitik.

Амэрыканцы спрыялі канфлікту тым, што, фактычна ўсынавіўшы Саакашвілі і прызначыўшы яго сваім сучым сынам, яны ня толькі заплюшчвалі вочы на ягоныя замежныя авантуры, але і на ўнутраную палітыку, якая пасьлядоўна кацілася да дыктатарскай (тут, дарэчы, расейцы цалкам маюць рацыю, але зноў — чыя б карова мычала...) Менавіта гэтае адчуваньне беспакаранасьці прывяло грузінскага лідэра да высновы, што Захад яго падтрымае ў любым разе. Тут навука для ўсіх, хто хоча быць чыімсьці сучым сынам — памятайце, што калі прыйдзе час выцягваць вас з ж..., даруйце — з лужыны, такія паплечнікі могуць узгадаць іншую прымаўку — свая кашуля бліжэйшая да цела.

Але сваю долю адказнасьці нясе і старая Эўропа. Як ні парадаксальна, але каб «прыструніць» Саакашвілі, Захад мусіў апрануць на яго «зьмірэнчую кашулю» абавязкаў, якая прымае на сябе краіна, што імкнецца стаць паўнапраўным сябрам эўраатлянтычнай супольнасьці. Але каб гэта адбылося, трэ былі дзьве рэчы. Першая — дакладны сыгнал, што Захад падтрымлівае грузінскую дэмакратыю, а не Саакашвілі асабіста. Гэта магло б адбыцца падчас парлямэнцкіх і прэзыдэнцкіх выбараў у Грузіі — чаго, як мы ведаем, не адбылося. Другая — гэта даць Грузіі дакладную пэрспэктыву далучэньня да НАТО, што якраз такі вымагала б шанаваньня Грузіяй дэмакратычных працэдураў і няўвязваньня ў авантуры, падобныя да апошняй (насуперак таму, што цьвердзіў у нядзелю прэм’ер Расеі Пуцін). Менавіта Францыя, якая разам зь Нямеччынай адмовіла Грузіі і Ўкраіне ў эўраатлянтычнай пэрспэктыве, зараз мусіць расхлёбваць за ўсю Эўропу кашу, якая заварылася.

Выправіць сытуацыю ў рэгіёне і стрымаць Расею магчыма, толькі калі Захад вернецца да маральных прынцыпаў замежнай палітыкі ў рэгіёне. На кану ня толькі лёс Грузіі і стратэгічных трубаправодаў, што мусілі прайсьці праз яе тэрыторыю. На кану лёс Украіны, якая імкліва робіцца наступным кандыдатам на дэстабілізацыю. На кану лёс самой Расеі, дзе прыхільнікі пуцінскага курсу амаль паверылі ў тое, што цяпер ляскат зброяй і пусканьне крыві можа стаць абсалютна беспакараным, а таму прымальным сродкам паводзінаў на постсавецкай прасторы. На кану рэпутацыя самой Эўропы як замежнапалітычнага гульца, які здольны вырашаць канфлікты і забясьпечваць стабільнасьць у сваім беспасярэдным атачэньні.

Бэрлін і Парыж пайшлі на саступкі Пуціну ў Бухарэсьце, але ў іх яшчэ ёсьць шанец пазьбегнуць усіх трагічных наступстваў палітыкі ўміратварэньня. Вашынгтон і Брусэль стаяць перад выклікам карэннага перагляду ўсёй сваёй палітыкі ў дачыненьні да Расеі і да постсавецкага рэгіёну, але ў любым выпадку гэтая палітыка мусіць выправіць памылку нядаўняй realpolitik — Грузія і Ўкраіна мусяць быць тэрмінова запрошаныя ў НАТО, прычым першая — толькі пры ўмове паўторнай здачы экзамэну на дэмакратыю.

Грузінскія войскі ня толькі рыўком узялі Цхінвалі — яны аказалі нечакана ўпартае супраціўленьне расейскай арміі, што ўступіла ў Грузію амаль імгненна і зьнянацку для грузінаў. Прычым грузіны ваявалі не па-савецку — ня колькасьцю, а ўменьнем. Яны ўнікалі небясьпечных боесутыкненьняў, пакідалі стратэгічна нязначныя населеныя пункты, але наносілі праціўніку максымальную шкоду. Паводле заяваў грузінскага боку, за пяць дзён ім удалося зьбіць 21 расейскі самалёт. Расея прызнае страту толькі 4-х, у тым ліку стратэгічнага бамбавіка Ту-22. Гэта ў любым разе болей, чым страціла ЗША за актыўную фазу баявых дзеяньняў у Іраку. Расея страціла ў зоне канфлікту з Грузіяй 74 вайскоўцы забітымі, 171 — паранэнымі, 19 чалавек прапалі бязь вестак. Такія лічбы падаў у сераду на брыфінгу намесьнік начальніка Генштабу Расеі Анатоль Нагавіцын.

Якім чынам краіна, што яшчэ чатыры гады таму лічылася недадзяржавай і дзе сярэдні заробак складаў 5 даляраў за месяц, здолела стварыць баяздольную армію? І ці маюць пад сабой грунт сьцьвярджэньні, што пераход ад аўтарытарызму да дэмакратыі, ад прарасейскае да праэўрапейскае арыентацыі і ад дзяржаўнае да прыватнае ўласнасьці канечне вядзе да аслабленьня якасьці сілавых структураў, як тое адбылося ў алігархічных Расеі і Украіне?

Артыкул аналітыка Фэльгенгаўэра зьявіўся ў расейскай «Независимой газете» напярэдадні канфлікту — гэта быў адказ на ранейшыя шапказакідацельскія публікацыі на тэмы Грузіі ў вайсковай дадатку да «Независимой газеты».

# «Грузія стварыла найлепшае войска на постсавецкай прасторы»

Працяг са старонкі 1.

Больш як год працягвалася вайна ў Абхазіі і скончылася ў 1993-м поўным разгромам і выгнаньнем грузінаў, улучна з 250 тыс. мірнага насельніцтва. З тае пары захавалася ўстойлівая нэгатыўная ацэнка баявых магчымасьцяў грузінскай дзяржавы і нацыі. Хоць перамагчы абхазам актыўна дапамагала Расея і добраахвотнікі з Паўночнага Каўказу, улучна з чачэнскімі баевікамі Шаміля Басаева.

Міхаілу Саакашвілі пасьля «рэвалюцыі ружаў» дасталіся кепска падрыхтаваная і ўзброеная армія. Улетку 200 г. грузіны паспрабавалі абкласьці Цхінвалі, парушыўшы ўстойлівае з 1992 г. перамір'е ў Паўднёвай Асэтыі, заснаванае на супольным транзытным кантрабандным гандлі праз Рокскі тунэль у Расею. Але нічога не дамагліся, толькі зазналі істотныя страты. Саакашвілі, правільна ацаніўшы няўдачу, рашуча ўзяўся за вайсковую рэформу.

## Ашаламляльныя перамены

У Расеі склалася цалкам скажонае ўяўленьне пра новую грузінскую кіраўнічую эліту. Саакашвілі — моцны, разумны, мэтаскіраваны і вельмі энэргічны нацыянальны лідэр. Ён, што праўда, вельмі нецярплівы, спрабуе ў закароткі тэрмін перарабіць Грузію і грузінаў зь цьвёрдым перакананьнем, як сваім часам Пётар Вялікі, што ведае лепш за ўсіх, што трэба ягонай краіне і народу. Каманда Саакашвілі складаецца збольшага з маладых, навучаных на Захадзе, энэргічных і спраўных людзей. Яны здолелі за чатыры гады перарабіць Грузію, як ніхто ня мог чакаць.

У Грузіі не змагаліся нібыта з карупцыяй — яе практычна ліквідавалі. Пакуль у Расеі нясьпешна целяпалі языкамі пра неабходнасьць вайсковай рэформы — у Грузіі стварылі з нуля збройныя сілы новага ўзору. Толькі адчайным невуцтвам можна было вытлумачыць расейскія спробы паставіць Грузію на калені, забараняючы ўвоз віна і баржому, грашовыя пераказы і авіярэйсы, уводзячы візавы рэжым. Неўзабаве высьветлілася, што эфэкт ад санкцый блізкі да нулявога, што «грузінскае віно» для РФ выраблялася на Паўночным Каўказе, што ў Тбілісі лёгка знайшлі замену расейскаму газу і электраэнэргіі, што летась грузінскі ВУП вырас на 16%.

Шпаркі рост эканомікі, масавая прыватызацыя дзяржаўнай маёмасьці на адкрытых для замежнікаў тэндэрах напоўнілі грузінскі бюджэт. За чатыры гады вайсковыя выдаткі выраслі ў 30 зь нечым разоў, дасягнуўшы 9—10% ВУП. У апошні год кіраваньня Шэварднадзэ — у 2003-м — вайсковы бюджэт Грузіі быў 30 млн даляраў. У 2004-м — 90 млн. У 2005-м — блізка 200 млн. У 2006-м — паўмільярду. У 2007-м вайсковы бюджэт двойчы пераглядалі ў бок павышэньня, і да канца году быў выдаткаваны 1 млрд даляраў.



PHOTO BYMEDIA.NET

Вялікія грошы былі патрачаныя разумна. У Грузіі спынілі прызыў і ўтварылі рэгулярнае ахвотніцкае войска з 30 тыс. чалавек. Апроч таго, зацьверджаная канцэпцыя народнай «татальнай абароны», але корпус рэзэрвістаў — 100 тыс. чал. — утвараюць па-амэрыканску, ствараючы добраахвотную нацыянальную гвардыю. У мірны час брыгады Нацыянальнай гвардыі будуць кадраваныя (па 47 афіцэраў і сяржантаў рэгулярнай службы ў кожнай), пры пагрозе — разгортваць у поўную моц. Мабілізацыя грузінскіх добраахвотнікаў-рэзэрвістаў забясьпечаная запасамі ўзбраеньня, боепрыпасаў і тэхнікі савецкага ўзору.

## На ўзроўні сучасных патрабаваньняў

Войска Грузіі складаецца з шасьці рэгулярных брыгадаў. 4 пяхотныя брыгады зьяўляюцца цалкам самастойнымі злучэньнямі па 3300 чалавек і складаюцца з трох пяхотных батальёнаў з 591 чалавека, 1 бранятанкавага батальёну, артылерыйскага батальёну, ротаў сувязі, тылу, інжынэрнасапёрнай. У цяперашні час у складзе пяхотных брыгадаў адбываецца падваеньне ліку танкаў: бранятанкавы батальён пераўтвараецца ў 2 танкавыя роты і 1 роту мотапяхоты.

Значная частка асабовага складу грузінскай пяхоты прайшла абкатку ў Іраку, дзе і сёньня разгорнута больш як 2 тыс. грузінскіх вайскоўцаў (трэці па велічыні кантынгент пасьля ЗША і Брытаніі, былі выведзены з Іраку пасьля пачатку баёў у Асэтыі — Рэд.).

Параўнальна малыя памеры патэнцыйнага тэатру вайсковых дзеяньняў у Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі і густая сетка дарог дазволяць грузінскаму камандаваньню эфэктыўна манэўраваць зьведзенымі ў адзіны кулак цяжкай артылерыяй і СЗА, ствараючы агнявую перавагу ў патрэбны час у патрэбным месцы.

Часткі грузінскага армейскага спэцназу зьведзеныя ў брыгаду спэцыяльнага прызначэньня. Усе верталёты зьведзены ў 6 эскадрыльяў вайскова-паветраных сілаў. Дзьве

> У Грузіі спынілі прызыў у войска і ўтварылі баяздольнае прафэсійнае войска ў колькасьці больш як 30 тысячаў чалавек.

транспартныя: Мі-8 і UH-1H. Дзьве ўдарныя: Су-25 і зьмяшаная Мі-8/Мі-17, Мі-24. Адна вучэбная — Л-39. Адна — бесьпілётнікаў (БПЛА — бесьпілётны лятальны апарат).

Зэнітна-ракетныя комплексы сабраныя ў складзе ВПС, а армейскія часткі насычаныя пераноснымі зэнітна-ракетнымі комплексамі (ПЗРК). Створаны сучасны адзіны аграцыйны камандны цэнтар вядзеньня паветранай абароны.

Асабовы склад рэгулярных пяхотных частак — больш за 17 тыс., ВПС — 2000, ВМФ — 700, адміністрацыйны апарат, служба тылу і іншыя дапаможныя службы — больш за 9000 чалавек. Генэральны штаб пераўтвораны паводле заходняга ўзору ў Аб'яднаны штаб.

У выпадку поўнамаштабнага канфлікту грузіны змогуць паставіць пад ружжо да 80 тыс. чалавек. У выпадку працяглага канфлікту — да 100 тыс. У 2009-м выкананьне заплянаваных мерапрыемстваў вайсковага будаўніцтва значна павялічыць абаронныя магчымасьці грузінскай дзяржавы ў якасьці і колькасьці, таму сёньня Тбілісі ня мае ніякага аб'ектыўнага інтарэсу ініцыяваць вайну менавіта цяпер.

Паралельна з выбудовай абаронных структураў урад Саакашвілі заняўся якасным пераабсталяваньнем Збройных сілаў. У 2007 г. пачаліся пастаўкі самай сучаснай тэхнікі і ўзбраеньняў, якіх ня маюць ні асэтынскія, ні абхаскія, ні расейскія войскі.

Грузіны закупілі некалькі дзясяткаў ізраільскіх БПЛА, кампутарную сыстэму кіраваньня баявымі дзеяньнямі і цэлеўказаньня, 155-мілімэтровыя самаходныя гаўбіцы, здольныя выкарыстоўваць дадзеныя бесьпілётнікаў для высокадакладнай стральбы на адлегласьці да 40 км.

Артылерыя і РСЗО «Град» савецкага ўзору, якіх у грузінскай арміі нямала, ня могуць быць наўпрост інтэграваныя ў кампутарызаваную сетку сучаснага высокадакладнага ўжываньня агнявых сродкаў паражэньня. Але разглядаецца частковая інтэграцыя: істотнае павышэньне дакладнасьці стральбы з выкарыстаньнем дадзеных БПЛА для карэктаваньня ў рэальным часе.

З дапамогай ізраільцаў мадэрнізавалі 7 штурмавікоў Су-25 для выкарыстаньня ўначы і ў кепскае надвор'е. Выкарыстоўваючы зьвесткі БПЛА з інфрачырвонымі камэрамі, грузінскія вайскоўцы, відавочна, могуць ужо сёньня ваяваць уначы з ударнай авіяцыяй і цяжкой артылерыяй, а патэнцыйныя праціўнікі — разнамасныя ўтварэньні сэпаратыстаў, паўночнакаўкаскіх добраахвотнікаў, дый расейскія войскі — сьляпыя і практычна безабаронныя.

## Сілы — ня роўныя

Сёньня ў Грузіі вайсковая і паліцэйская службы маюць высокі прэстыж. Жаўнеры і афіцэры атрымліваюць істотныя ў грузінскіх маштабах грошы — ад 500 да 1000 даляраў за месяц. Пабудаваныя адпаведныя заходнім стандартам вайсковыя базы. Саакашвілі часта наведвае базы свайго войска, начуе там і есьць салдацкую ежу. Для дадатковага зьяднаньня асабовага складу жаўнеры і камандзіры па-амэрыканску ядуць разам у адных сталоўках аднолькавую ежу. Кормяць добра. У расейскай арміі падобнае неймаверна.

У Грузіі дзейнічаюць нацыянальная вайсковая акадэмія для малодшых афіцэраў і створаная зь нямецкай дапамогай школа для падрыхтоўкі прафэсійных сяржантаў. Старшых афіцэраў рыхтуюць у заходніх ваенных акадэміях. З францускай дапамогай створаная школа горнай вайны. Грузінскія горныя інструктары прайшлі навучаньне ў францускіх і швайцарскіх горных войсках і дзейныя на год камандзіруюцца ў Францыю для перападрыхтоўкі. Саакашвілі здолеў стварыць за кароткі тэрмін хоць невялікую, але самую якасную армію на постсавецкай прасторы.

У сучаснай Грузіі ніхто, нават найбольш па-сяброўску настроеныя да Расеі людзі, не гатовы аддаць Абхазію і Паўднёвую Асэтыю бяз бою. У выпадку збройнага канфлікту грузінскія жаўнеры будуць ваяваць за вызваленьне роднага краю і вяртаньне сотняў тысячаў уцекачоў, адчуваючы падтрымку ўсяго народу.

У праціўнікаў грузінаў сытуацыя іншая. Пасьля масавай раздачы жыхарам Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі расейскіх пашпартоў абедзьве жабрачыя самаабвешчаныя рэспублікі канчаткова абязьлюдзелі — пачалася масавая міграцыя ў Расею, у Турэччыну ў пошуках працы. Паводле ацэнак міжнародных назіральнікаў з АБСЭ і ААН, у Паўднёвай Асэтыі сёньня засталося менш як 30 тыс. асэтынаў, а ў Абхазіі з 140 тыс. пастаяннага насельніцтва — абхазаў толькі 30%. Але ва ўладзе, у сілавых структурах спрэс абхазы, і толькі трохі яны разбаўленыя прыкамандзіраванымі расейскімі спэцыялістамі.

Са словаў жа першага намесьніка міністра абароны Расеі генэрала Аляксандра Калмакова, «падрыхтоўка і абсталяваньне расейскіх войскаў і сілаў флёту адпавядае ўзроўню 60—70-х гадоў XX стагодзьдзя». Таму цяжкай будзе для нашых недэфармаваных Збройных сілаў задача эфэктыўна ваяваць на чужой тэрыторыі, за непраходным узімку і цяжкапраходным улетку Каўкаскім хрыбтом.

**Пераклаў РМ, скарочана**

# Dura lex

Піша эканаміст **Янка Багаслоў**.

Не мая гэта справа, але ж менавіта ў такія справы заўжды карціць усунуць свой нос. Нават тады, калі новы закон аб правапісе (антонім — неўнармаванае левачытаньне) можа не пасьпець увабрацца ў моц праз запуск Велькага гадроннага калайдэру. Адылі, калі вы чытаеце «НН», то ў калайдэры вы ня верыце, інакш даўно б бавілі час за якімсьці (шкодным) улюбёным заняткам. Дык вось, колькі словаў…

### …да адэптаў

Прыхільнікам клясычнага правапісу, якія ня могуць чытаць тэксты, напісаныя наркамаўкай, прапаную параўнаць «Ладзьдзю роспачы» Караткевіча зь любым творам, друкаваным «тарашкевіцай» (апроч Барадуліна). Адэптам унармаванага правапісу — паслухайце людзей, якія ня чулі мовы ад тых, хто гаварыў на ёй жыцьцё — бабуляў ды дзядуляў (ну, і Булгакава, вядома ж :)). На форумах «НН» вельмі дакладна заўважылі, што ў слове «сьвет» мяккага знаку ад іх не дачакаесься.

Горда закрыцца ці нягорда застацца? Закон аб правапісе паставіў незалежныя беларускамоўныя выданьні перад цяжкім выбарам.

### …да тых, хто вітае

Тут усё вельмі проста. Ёсьць дзьве мовы. На адной мове можна пісаць як заўгодна. На другой мове за памылкі прадугледжаны пакараньні. Якую мову абяруць бацькі для сваіх дзяцей? Адказ відавочны. Гэта — слова ад эканаміста, які ведае, што людзі рэагуюць на стымулы. І які ведае, што нормы, якія ўсталёўваюцца штучна, заўжды перашкаджаюць разьвіцьцю.

### …да тых, хто сарамаціць

Хто ўпэўнены, што пікеты ці нават велькія шэсьці супраць закрыцьця выданьняў, што цяпер друкуюцца ў папяровых вэрсіях, будуць мець плён? І хто будзе спрачацца з тым, што гэтыя выданьні робяць і зробяць вялізны ўнёсак у разьвіцьцё беларускай мовы — ня той, у якой ёсьць «здзелкі», «дагаворы» і «багатыры», а той, дзе «ўгоды», «дамовы» і «асілкі».

### …да тых, хто піша пра прэзыдэнтаў

Магу прапанаваць некалькі парадаў, грунтаваных на ўласным досьведзе. Напрыклад, навошта пісаць «Прэзыдэнт Пуцін», калі дастаткова напісаць проста «Пуцін»? Калі ўжо надта карціць назваць Пуціна прэзыдэнтам, то напішыце слова «прэзыдэнт» на пачатку сказу. Нарэшце, зусім неабавязкова пісаць «дэкрэт (ці ўказ альбо дырэктыва) прэзыдэнта Пуціна» — бо ніхто акрамя прэзыдэнта такія дакумэнты не выдае. Выраз «прэзыдэнт Пуцін падпісаў дэкрэт» амаль ва ўсіх выпадках лёгка трансфармуецца ў фразу «былі прыняты дэкрэт», а калі не — то ў два ўзгаданыя раней варыянты.

### …да тых, хто друкуе кніжкі

Кніжкі галоўнейшыя за законы, прэзыдэнтаў і адэптаў. Зрэшты, якая-колечы ацалее пасьля чарговага калайдэру (прычым папяровыя кніжкі лепшыя за аўдыё, бо, каб прайграць аўдыёкніжкі, нашчадкам давядзецца вынайсьці такі самы фармат запісу, што існуе цяпер). Дык пра кніжкі. Ніхто не забароніць друкаваць іх клясычным правапісам за мяжой (а мо і ў Беларусі). Ніхто ня скажа, што тое, што друкуецца цяпер «наркамаўкай», кепскае й непатрэбнае. Але шмат хто скажа, што друкуецца халерна мала. А я скажу, што зусім не друкуецца кніжак для маленькіх-маленькіх дзетак. Кніжак-кардонак. Якія не падзярэ й ня зьесьць дзіцятка, якому цікава пагартаць кніжку ды паслухаць, як мама чытае трошкі тэксту каля вялікіх і прыгожых малюнкаў. Кніжкі для большанькіх дзетак ёсьць. Шмат якія былі — дбаньнем «Мастацкай літаратуры» й «Юнацтва». Але чаму бацькі павінныя купляць іх, калі іхныя дзеткі пачалі свае знаёмства з кніжкамі з расейскае мовы? Людзі рэагуюць на стымулы…




**Ці знойдуць агульную мову прыхільнікі наркамаўкі і тарашкевіцы?**

# Выяжджаць ці не выяжджаць?

Ужо 10 гадоў я на эміграцыі. Я зьехаў з Польшчы ў Чэхію ў 1998 г., сям'я далучылася да мяне годам пазьней. Піша **Ян Максімюк**.

Галоўны матыў выезду быў эканамічны — хацелася папраўіць матэрыяльнае становішча сям'і. Але я ня думаю, што 10 гадоў таму я пераехаў бы ў Прагу прадаваць макарону або мабільнікі. Праца мелася датычыць Беларусі, і гэта было ня менш важнае, чым лепшая зарплата.

Нашае сямейнае матэрыяльнае становішча не было зусім дрэнным і ў Польшчы — я працаваў перакладчыкам у амэрыканскім пасольстве ў Варшаве і зарабляў даволі прыстойна, прынамсі паводле тадышніх польскіх мерак. Але таго польска-амэрыканская заробку хапала толькі, каб аплаціць наяўныя выдаткі і мець у што апрануць сям'ю. Я мог адно памарыць, што калі-небудзь куплю сабе ўсе музычныя альбомы «Пінк Флойд» або ўсе раманы Грэма Грына ці Джона Ле Карэ. Бо ў Польшчы былі больш надзённыя праблемы — прыкладам, як заашчадзіць на прыстойную пральную машыну. А мне ўжо было 40 гадоў. І да таго — сям'я жыла ў Беластоку, а я туды наведваўся адно ў канцатыдні. Чатыры з паловай гады такога «цягніковага» жыцьця выматалі мяне псыхічна. Я фактычна ня бачыў, як падрастаюць мае сыны.

> Хочаце зьехаць — зьяжджайце. Але ня майце прэтэнзіяў да мяне потым, калі вам давядзецца плаціць сваю цану за выезд.

Гэта не апраўданьне сваіх «уцёкаў» з Бацькаўшчыны, а проста зьмяшчэньне свайго эміграцыйнага лёсу ў канкрэтную сыстэму каардынатаў. Я лічу, што эканамічную эміграцыю ня трэба неяк апраўдваць. Але так я думаў не заўсёды. Напрыклад, у свае студэнцкія гады на зломе 1970-х і 1980-х мой погляд на эміграцыю цалкам супадаў з афіцыйнай камуністычнай прапагандай таго часу: эміграцыя за лепшым заробкам (на Захад, вядома, бо куды ж яшчэ?) — гэта сама менш ганебныя ўцёкі, калі ня здрада сваёй Бацькаўшчыне. Ну й лухта, можа сказаць мне цяпер нехта з пакаленьня дваццацігадовых. Згода. Але тады так думалі мільёны. Дый ня толькі ў Польшчы.

Сёньня эканамічная эміграцыя, прынамсі ў гэтай частцы сьвету, дзе я сяджу, успрымаецца амаль як неадлучны элемэнт грамадзкага і палітычнага жыцьця. Лепей жыць — ці ж ня гэта абяцае сваім грамадзянам кожны ўрад? Ды ня кожны стрымлівае свае абяцанкі. А таму некаторыя грамадзяне выбіраюць працу ў падатковай сыстэме такога ўраду, у якога абяцанкі не разыходзяцца занадта радыкальна зь месячнай зарплатай і цэнамі на хлеб і кілбасу ў краме.

Значыць, усё для мяне так проста?

Не, ня ўсё. Бо эміграцыя, ці то палітычная, ці то эканамічная — яна заўсёды вяжацца з духоўным і сацыяльным выкараненьнем, як сваім, гэтак і сваіх нашчадкаў. Я ўжо не зусім той для людзей на Беласточчыне, кім быў 10 ці 20 гадоў таму. Мае дзеці ўжо ніколі не адчуюць таго шчымлівага халадка, які адчуваецца мне, калі паварочваю з шашы Беласток—Бельск на Плёскі, праяжджаю гэтую вёску, потым плёскаўскі лес, потым Кожына, а потым свой лес (у цалкам літаральным сэнсе — я ўласьнік гектару лесу на Беласточчыне) і заяжджаю на свой колішні хутар.

У мяне файныя чэскія суседзі, зь якімі можна вельмі прыемна правесьці час суботнім вечарам за бутэлькай віна і пагаманіць пра сёе-тое. Але менавіта пра «сёе-тое», бо пра «сваё» мы пагаварыць ня можам. Бо «сваё» ў нас — рознае і непераказнае.

А таму я пакіну пытаньне, вынесенае ў загаловак гэтага тэксту, без адназначнага адказу.

Хочаце зьехаць — зьяжджайце. Але ня майце прэтэнзіяў да мяне потым, калі вам давядзецца плаціць сваю цану за выезд.

Я сваю ўжо заплаціў, хоць, можа, яшчэ не да канца. Яна не вымяраецца ў далярах.

# Батанічны сад

Піша **Віталь Тарас.**

Гадоў пяць таму давялося пабачыць на вуліцы Старавіленскай у Менску самотную грушу — усё, што засталося ад колішняга дзедаўскага саду. На месцы дому, дзе я вырас, даўно пабудаваны шматпавярховы будынак, у якім месьціўся нейкі інстытут. Цяпер няма й таго дрэва, інстытут кудысьці пераехаў… Вяртаюся да тэмы не для таго, каб ліць сэнтымэнтальныя сьлёзы. Лічу, што пасьляваенныя драўляныя дамкі «прыватнага сэктару» ніколі не ўпрыгожвалі горад. Саматужна пабудаваныя некалі на ўскраінах, бяз пляну й стылю, **яны былі прырэчаныя на знос**.

Урбанізацыя — аб'ектыўны працэс. І далёка ня кожная, нават старадаўняя, камяніца зьяўляецца помнікам, за які трэба змагацца (хоць, напэўна, гісторыкі архітэктуры са мной не пагодзяцца).

Але ёсьць у кожным месьце сакральныя рэчы. Гаворка ня толькі пра храмы. Прынамсі, ня толькі храмы ў звычайным сэнсе слова маю на ўвазе…

### Ня храм, але майстэрня

У дзяцінстве зь сябрамі вельмі любіў хадзіць у Батанічны сад, асабліва ўлетку. Не дзівіцца на прыгожыя кветкі, а зьбіраць там (што было катэгарычна забаронена) грэцкія арэхі, сьлівы, алычу. Недзе ў самых недагледжаных мясьцінах саду яе было шмат. Канечне, мы хадзілі ў «батанічку» ня толькі па арэхі. Для мяне гэта была адна з самых загадкавых і таму прывабных мясьцінаў у горадзе. Як толькі ты ўваходзіў у Батанічны сад, адразу трапляў у дзівосны сьвет. Недзе побач заставаўся парк Чалюскінцаў зь яго танцпляцоўкай, прымітыўнымі савецкімі атракцыёнамі й небясьпечнымі (асабліва ў цёмны час сутак) сьцежкамі, шумны ўжо тады праспэкт, натоўпы людзей. А тут можна было гадзінамі блукаць у цішыні таемнымі сьцежкамі, адчуваючы сябе ледзь не рабінзонам на бязьлюднай высьпе альбо Паганэлем. А яшчэ возера зь лебедзямі ў цэнтры саду…. Больш цудоўную мясьціну для рамантычных спатканьняў цяжка ўявіць.

Батанічны сад у Менску — ня самы стары ў Эўропе. Ён быў закладзены ў 1932-м. (Першы, у Вэнэцыі, зьявіўся на пачатку XIV стагодзьдзя). Але ж гэта адзін з самых вялікіх эўрапейскіх садоў паводле плошчы (153 гэктары) і паводле калекцыяў расьлінаў — больш за 9 тысячаў відаў.

Нядаўна тут збудавалі новую аранжарэю.

А неўзабаве ў Батанічным садзе зьявяцца тэнісныя корты. Само гэтае словазлучэньне гучыць як нейкі абсурд, нонсэнс.

На афіцыйным сайце Цэнтральнага батанічнага саду НАН РБ — між іншага, расейскамоўным — у разьдзеле «Рэканструкцыя» чытаем: «Будаўніцтва летній спартовай пляцоўкі (двух тэнісных кортаў) на лузе каля возера ці на іншым адкрытым для наведнікаў участку Саду не плянуецца. Для заняткаў спортам супрацоўнікам Саду (так у тэксьце!) пабудуюць адкрытыя спартовыя пляцоўкі на тэрыторыі, абмежаванай агароджай па вуліцы Акадэмічная і гаспадарчым дваром…»

Старшыня прэзыдыюму Акадэміі навук Міхаіл Мясьнiковiч сфармуляваў усё прасьцей: «Гэта быў абсалютна нявартны кавалак зямлі, там коні пасьвіліся. Што дрэннага ў тым, што, напрыклад, пакуль мама з дачкой, што прыйшлі ў сад, нюхаюць кветкі, бацька з сынам пагуляюць у тэніс ці бадмінтон? Камусьці падалося, што там будуць зьбірацца для гульні ў тэніс VIP-пэрсоны, але гэта поўная лухта».



PHOTO.BYMEDIA.NET

З заявы Мясьнiковiча вынiкае, што корты будуюцца ня толькі для «супрацоўнікаў Саду». Пра тое, што на тэрыторыі ЦБС паводле яго статусу нельга будаваць спартовыя аб'екты, няма й згадкі. Ну, што ж — прырода, як мы памятаем, ня храм, але майстэрня. І яшчэ. Мы ня можам чакаць міласьціяў ад прыроды — наша задача ўзяць іх.

### Суд «гонару»

У Санкт-Пецярбургу на будынку Інстытуту расьлінаводства можна бачыць мэмарыяльную шыльду з надпісам: «Навукоўцам Інстытуту, якія гераічна захавалі сусьветную калекцыю насеньня ў гады блякады». У гэтым інстытуце падчас блякады Ленінграду захоўваліся ў мяхах і кардонках дзясяткі тонаў насеньня, клубні бульбы: калекцыя налічвала 200 000 узораў. Нягледзячы на голад, ніхто з супрацоўнікаў нават не падумаў да іх дакрануцца.

Гэты подзьвіг не перашкодзіў органам дзяржбясьпекі зьнішчыць складальніка ўнікальнай калекцыі Мікалая Вавілава.

Калекцыя Вавілава мела важнае значэньне для развіцця генэтыкі. Безь яе немагчыма было б вырашыць, у прыватнасьці, усясьветную праблему ўраджайнасьці й харчаваньня. Але пасьля таго, як Лысенка зьмяніў Вавілава на пасадзе, генэтыка ў СССР была абвешчаная ілжэнавукай.

60 гадоў таму, на сэсіі Ўсесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук (яна праходзіла 31 ліпеня — 8 жніўня 1948 г.) большасьць савецкіх генэтыкаў былі затаўраваныя як «вайсманісты-марганісты» — паводле прозьвішчаў малавядомага нямецкага нэадарвініста Аўгуста Вайсмана і амэрыканца Томаса Ганта Моргана, заснавальніка сучаснай генэтыкі, ляўрэата Нобэлеўскай прэміі). Сярод тых, хто выступіў на сэсіі, быў і выбітны беларускі навуковец Антон Жэбрак. Адрозна ад іншых аратараў, якія толькі каяліся ў граху «марганізму», Жэбрак не пасаромеўся казаць і пра посьпехі, дасягнутыя ў ягонай лябараторыі насуперак антынавуковай тэорыі «яравізацыі» Трафіма Лысенкі. Са стэнаграмы сэсіі відаць, што спробы Лысенкі зьбіць выступ прафэсара зьняважлівымі пытаньнямі зь месца не далі плёну.

Між тым, яшчэ ў лістападзе 1947-га Жэбрак быў пазбаўлены званьня акадэміка і зьняты з пасады Прэзыдэнта АН БССР. Пасьля гэтага ў Маскве, у Політэхнічным музэі адбыўся так званы Суд гонару, які прызнаў прафэсара Жэбрака вінаватым у антыграмадзкіх учынках і вынес яму «грамадзкую вымову». У 1937-м, несумненна, гэтая гісторыя мела б іншы працяг.

### Марганісты і аграномы

Пачатак яе трэба шукаць у артыкуле прафэсара Гарвардзкага ўнівэрсытэту Сакса ў красавіцкім нумары часопісу Science за 1944 год пад назвай «Савецкая біялёгія», дзе высьмейвалася тэорыя яравізацыі Лысенкі. Гэтая тэорыя, на думку аўтара, выглядала б архаічнай, нават калі б яна зьявілася ў 1800-м. Між тым, ягонае імя ў Савецкім Саюзе вылучаецца на першы плян, пісаў Сакс, а вось імёнаў сапраўдных савецкіх генэтыкаў апошнім часам не чуваць. Што з Вавілавым? — задаваў ён, у прыватнасьці, пытаньне. На завяршэньне Сакс пісаў : «нашае захапленьне расейскім народам і вайсковай магутнасьцю Савецкай рэспублікі не павінныя засланяць тую акалічнасьць, што навука не свабодная ў таталітарных краінах, дзе павінна прыстасоўвацца да палітычнай філязофіі». (Тут і далей цыт. паводле манаграфіі А.Соніна «Дело» Жебрака и Дубинина»).

Пасьля гэтага Жэбрак напісаў сакратару ЦК ВКПБ Малянкову некалькі лістоў, у якіх зьвяртаў увагу на артыкулы ў Science на тэму савецкай генэтыкі. Жэбрак, падтрымліваючы крытыку Лысенкі, якога ён сам называў не інакш, як «аграномам», прапаноўваў даць адказ заходнім навукоўцам з мэтай давесьці, што савецкая навука не знаходзіцца пад палітычным ціскам. Яму здавалася, што гэта яму дапаможа ў барацьбе з лысенкаўшчынай. Жэбрак, дарэчы, некалькі гадоў стажыраваўся ў Каліфарнійскім унівэрсытэце, меў аўтарытэт сярод заходніх калегаў.

Адказу з Крамлю акадэмік не атрымаў.

Але ў 12-м нумары Science за 1945 год быў надрукаваны ягоны артыкул з адказам Саксу. Зразумела, у той час надрукаваць нешта ў амэрыканскім часопісе без санкцыі на самым версе было немагчыма. Дый рыхтавалася публікацыя, насамрэч, у «Совинформбюро».

У 1947-м сытуацыя, аднак, зьмянілася. Пачалася кампанія барацьбы з «низкопоклонством перед Западом», і гэтым скарысталіся Лысенка з сваёй хеўрай. У сакавіку ў «Правде» быў апублікаваны артыкул ягонага памагатага Ісая Прэзэнта пад назвай «Барацьба ідэалёгіяў у біялягічнай навуцы», дзе гаварылася, што «фашысцкі часопіс «Навука» ў Амэрыцы апублікаваў артыкул цемрашала Сакса супраць марксізму, а прафэсар Жэбрак, нібыта, салідарызаваўся зь ім «у ацэнцы тэарэтычных дасягненьняў нашай савецкай перадавой школы біёлягаў, мічурынскай школы на чале з акадэмікам Лысенкам». Жэбраку напомнілі, што ён называў Лысенку «аграномам». Жэбрак прызнаў гэта «палітычнай памылкай». Супраць яго і яшчэ аднаго вядомага генэтыка — Дубініна, было распачатае папярэдняе сьледзтва. Не пасьпела яно скончыцца, як 17 кастрычніка 1947 году адбылося закрытае пасяджэньне Прэзыдыюму АН БССР, на якім Жэбрака адхілілі ад усіх пасадаў. Але ад крытыкі агранома Лысенкі ён так і не адмовіўся.

### Прафанацыя

«Справа» Жэбрака і разгром генэтыкі ў СССР — толькі адзін прыватны выпадак. Пасьля была спроба абвясьціць тэорыю адноснасьці Айнштайна «яўрэйскай фізыкай». І толькі неабходнасьць стварэньня ядравай зброі ўратавала савецкага фізыка Сяргея Вавілава ад лёсу ягонага брата Мікалая, а савецкую фізыку ад разгрому.

Кібэрнэтыку ў Савецкім Саюзе абвясьцілі «пакаёўкай імпэрыялізму».

Вынікі дасягненьняў навукоўцаў-мэліяратараў дагэтуль можна бачыць на прыкладзе асушэньня Палесься ды абмяленьня многіх рэк і азёраў Беларусі.

Найгоршы лёс чакаў, аднак, гуманітарныя навукі, найболып залежныя ад «дзяржаўнай ідэалёгіі». Савецкая гістарычная навука спарадзіла, напрыклад, такую зьяву, як «абэцэдаршчына» — агрэсіўнае адмаўленьне ўсяго нацыянальнага ў гісторыі Беларусі.

На пачатку 1970-х вымушаны быў пакінуць Менск выкладчык філязофіі, прафэсар Вячаслаў Сьцёпін, якога ўлады абвясьцілі ледзьве не дысыдэнтам. У Маскве ён стаў акадэмікам.

Можна згадаць шматгадовую дзейнасьць іншага прафэсара — доктара філязофскіх навук Віктара Боўша на ніве барацьбы зь міжнародным сіянізмам. (Ягоны артыкул «Сіянізм» з трызьненьнем пра сусьветны яўрэйскі капітал можна прачытаць у томе Беларускай энцыкляпэдыі, які выйшаў у 2002 г.).

Можна ўспомніць, як зь Беларускай энцыкляпэдыі літаратуры й мастацтва выкідаўся артыкул пра Марка Шагала.

Ну, і нарэшце, як не згадаць новыя правілы беларускага правапісу, якія маюць дачыненьне ня столькі да філялягічнай навукі ды ўвогуле мовы, колькі да адміністрацыйнага карнага кодэксу й паліцэйшчыны.

Прафанацыя з навукі пранікла ва ўсе сфэры нашага жыцьця. Калі побач з музэем Купалы будуецца рэстаран, чаму б не пабудаваць корты ў навуковай установе? Потым побач зь імі можна будзе збудаваць саўну, залю для більярду, бар… Пакуль мама «будзе нюхаць кветкі», чаму б бацьку з сынам і сябрамі не адпачыць па поўнай праграме?

Можна, канечне, прыводзіць і шматлікія прыклады дасягненьняў беларускіх навукоўцаў — у геалёгіі, лязэрнай фізыцы, фізыцы цьвёрдага цела, парашковай мэталюргіі і г.д. Вось толькі прыклады грамадзянскіх паводзінаў у сучаснай навуцы ў наш час рэдка сустрэнеш.

Навука, як і ўзровень культуры, усяго толькі адлюстроўвають узровень развіцця грамадзтва? Калі б так было, не шанавалі б мы сёньня імёнаў Галілея, Каперніка, Скарыны. Які, між іншага, ня толькі выдаў у Празе першую сваю кнігу «Псалтыр», але й працаваў там на пачэснай пасадзе каралеўскага садоўніка.

# «Байкот азначае адсутнасьць усякай працы»

Выходнымі тры найбуйнейшыя дэмакратычныя партыі правялі зьезды, прысьвечаныя падрыхтоўцы да парлямэнцкіх выбараў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Яраслаў Берніковіч на зьезьдзе Партыі БНФ.**

10 жніўня ў Менску прайшоў пазачарговы зьезд партыі БНФ. Дэлегаты вылучылі чатырох кандыдатаў на парлямэнцкія выбары. Але, паводле словаў старшыні партыі Лявона Баршчэўскага, БНФ пакідае за сабой права зьняцца з парлямэнцкай кампаніі, калі ня спыніцца перасьлед прэтэндэнтаў на кандыдатаў — з працы звольнілі кобрынца Аляксандра Меха і Леаніда Аўтухова з Гарадку, тэрмінова прызвалі ў войска Віталя Каратыша з Кажан-Гарадку, адмовілі ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы Зьмітру Вінаградаву зь Мядзелу.

Закранулі на зьезьдзе і пытаньне прэзыдэнцкіх выбараў. Старшыня БНФ сказаў, што партыі важна вылучыць у 2011 г. свайго кандыдата. Баршчэўскі прызнаўся, што меў на гэты конт перамовы з Андрэем Саньнікавым. На прапанову ўступіць у БНФ (гэта ўмова вылучэньня ў кандыдаты ад партыі) каардынатар «Хартыі-97» так і ня даў адказу.

Намесьнік старшыні БНФ Юрась Губарэвіч аспрэчваў: на ягоную думку, партыя сёньня ня зможа сабраць патрэбную колькасьць подпісаў за кандыдата ў прэзыдэнты. Губарэвіч заклікаў ня страчваць патэнцыял, напрацаваны ў мінулыя гады і падтрымліваць Аляксандра Мілінкевіча, зь якім выбарцаў ня трэба наноў «знаёміць».

Электрызавала зьезд «пытаньне Міхалевіча». Намесьнік старшыні Алесь Міхалевіч быў выключаны з партыі 14 чэрвеня за інтэрвію інтэрнэт-газэце «Салідарнасьць», у якім раскрытыкаваў кіраўніцтва Фронту. Супраць ягонага аднаўленьня прагаласавалі 33 дэлегаты зьезду, за — 28, устрымаліся — 2. Як і на мінулым зьезьдзе, галасы падзяліліся амаль напалам.

Кампрамісная прапанова аднавіць Міхалевіча як шараговага сябра партыі сустрэла пратэст старэйшых фронтаўцаў. Зрэшты, Міхалевіч сам адмовіўся ад падобнага галасаваньня. На сёньняшні момант зноў прыняць палітыка ў партыю можа любая раённая структура.

Партыя камуністаў Беларуская (ПКБ), якая таксама правяла зьезд 10 жніўня, выстаўляе на выбары 18 прэтэндэнтаў. Паводле словаў прэс-сакратара ПКБ Сяргея Вазьняка, 12 сяброў ПКБ ужо сабралі па тысячы подпісаў, неабходных для рэгістрацыі кандыдатам.

Таксама падчас зьезду камуністы пастанавілі падаць у суд зыск аб абароне гонару і дзелавой рэпутацыі ПКБ. Адказчыкамі выступяць Аляксандар Лукашэнка, Белтэлерадыёкампанія і дзяржаўная інфармацыйная агенцыя БЕЛТА. «Гэта зьвязана з нашумелым выступам А.Лукашэнкі падчас наведваньня «Лініі Сталіна», дзе ён зьвінаваціў ПКБ у фашызьме, а дзяржаўныя агенцыі гэтую інфармацыю растыражавалі», — заявіў С.Вазьняк.

Дэлегаты зьезду Аб’яднанай грамадзянскай партыі таксама былі далёкія ад ідэі байкоту выбараў. На думку кіраўнікоў абласных арганізацыяў партыі, цяпер улады паводзяць сябе больш лібэральна, чым падчас мінулай парлямэнцкай кампаніі. Таму байкот было вырашана трымаць як апошні аргумэнт. «Байкот ва ўмовах Беларусі азначае адсутнасьць усякай працы, — адзначыў кіраўнік АГП Анатоль Лябедзька. — Гэта магло б зьвесьціся да некалькіх піяр-кампаніяў — зрабіць расьцяжкі, выйсьці, каб затрымалі і далі 10—15 сутак. Пасьля выехаць у Варшаву ці ў Брусэль і сказаць, якія мы велізарныя змагары. Рашэньне АДС удзельнічаць у кампаніі, якія б праблемы не ўзьнікалі, абсалютна правільнае». Зьезд вылучыў 13 партыйцаў у якасьці патэнцыйных кандыдатаў у дэпутаты. Сёлетняя кампанія нясе сюрпрызы і самім прэтэндэнтам. «Я думаў, што людзі пабаяцца падпісвацца за мяне, — кажа кандыдат у дэпутаты па Жодзінскай акрузе Аляксандар Ваўчанін. — Але пачалі падпісвацца. І ў гарвыканкаме начальства ўбачыла, што неадназначная сытуацыя, што за апазыцыянэрам ідуць».

**Зьміцер Панкавец; СМ паводле радыё «Свабода», БелаПАН**

### АДС вылучылі ва ўчастковыя камісіі 1300 чалавек

Аб’яднаныя дэмакратычныя сілы Беларусі (АДС) вылучылі ў склад участковых выбарных камісій больш як 1300 чалавек. Найбольш актыўна прэтэндэнтаў вылучала ПКБ — каля 450, АГП — 360. Усяго мае быць створана 6485 участковых камісій. Найбольш іх будзе ў Менскай і Гомельскай абласьцях — 1125 і 1121 адпаведна. У Берасьцейскай — 982, у Віцебскай — 948, у Магілёўскай — 839, у Гарадзенскай — 775, у Менску — 695.

### 1 жніўня

#### Шчучын

У шчучынскім міжрэгіянальным аддзеле КДБ адбыўся допыт актывіста апазыцыі з Мастоў **Алеся Зарамбюка**. Сьледчага КДБ **Івана С.** цікавіла, дзе знаходзіўся Алесь 3 ліпеня, у ноч на 4 ліпеня, а таксама ўдзень 4 ліпеня, ці ведае ён кагосьці, хто ўмее рабіць выбухоўку, ці служыў ён у войску, ці чуў што-небудзь пра выбух у нейкім мястэчку Н. і пра знаходку ў Горадні гранатамёта ў 2006 г. Пры канцы размовы Алесю прапанавалі зьняць адбіткі пальцаў, але хлопец адмовіўся.

#### Асіповічы

Супрацоўнікі Асіповіцкага РУУС затрымалі мясцовага актывіста незарэгістраванага «Маладога фронту» **Арцёма Дубскага**. Арцёму паведамілі, што ён затрыманы па падазрэньні ў зьдзяйсьненьні злачынства, прадугледжанага арт. 216 КК («Прычыненьне ўрону маёмасьці без прыкметаў крадзяжу»). Артыкул прадугледжвае пакараньне ад штрафу да пазбаўленьня волі тэрмінам да трох гадоў. Акрамя таго хлопцу сказалі, што цягам 3 дзён ён будзе знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрыманьня, пасьля чаго будзе пераведзены ў сьледчы ізалятар.

#### Наваградак

Да кіраўніка Навагрудзкай суполкі АГП **Артура Майсяевіча**, які зьяўляецца сябрам ініцыятыўнай групы **Юр’я Істоміна** па Навагрудзкай выбарнай акрузе №57, завіталі супрацоўнікі КДБ. Яны задалі актывісту толькі адно пытаньне: ці сапраўды той належыць да апазыцыйнай партыі АГП. Атрымаўшы станоўчы адказ, заявілі, што мусяць узяць у зборшчыка подпісаў адбіткі пальцаў. Патлумачылі гэта адпаведным загадам кіраўніцтва.

### 4 жніўня

#### Менск

Супрацоўнік КДБ **Юры Салаўёў** патэлефанаваў намесьніку старшыні партыі БНФ, кандыдату ў дэпутаты **Аляксею Янукевічу** і запрасіў на размову ў зьвязку з выбухам у Менску 3 ліпеня. Сп.Янукевіч папрасіў аформіць запрашэньне належным чынам.

#### Магілёў

Супрацоўнікі КДБ выклікалі для размовы пра выбух у Менску 3 ліпеня **Барыса Вырвіча**, кіраўніка ініцыятыўнай групы кандыдата ў дэпутаты, старшыні Магілёўскай абласной арганізацыі партыі БНФ **Рыгора Кастусёва**. Сп.Вырвіч адмовіўся зьявіцца для допыту без адпаведнай позвы.

### 5 жніўня

#### Менск

**Менгарвыканкам** адмовіў незарэгістраванаму **«Маладому фронту»** ў правядзеньні рэгістрацыйнага зьезду на Кастрычніцкай плошчы і не прапанаваў іншага месца ці памяшканьня для яго правядзеньня. Адмова Менгарвыканкаму грунтуецца на той падставе, што мэтро знаходзіцца бліжэй за 200 мэтраў ад плошчы. Прадстаўнікі арганізацыі лічаць гэта парушэньнем закону і зьбіраюцца судзіцца.

У офіс Беларускага Хэльсынкскага камітэту прыйшлі два супрацоўнікі падатковай інспэкцыі Маскоўскага раёну Менску — **В.Дзяшковіч** і **Д.Саракапыт**. Мэтай свайго візыту яны назвалі правядзеньне пазаплянавай комплекснай праверкі бухгальтарскай дакумэнтацыі, а таксама руху фінансавых сродкаў БХК. Найперш іх цікавілі крыніцы сродкаў на арэндную плату і камунальныя выдаткі.

#### Кобрынь

У Кобрынскім судзе адбыўся папярэдні разгляд справы па скарзе актывіста партыі БНФ **Аляксандра Меха**, які абскарджваў сваё звальненьне з Кобрынскага філіялу прадпрыемства «Белтрансгаз». Кантракт з сп.Мехам ня быў працягнуты пасьля таго, як ён заявіў пра свой намер удзельнічаць у восеньскіх выбарах. Судзьдзя **Аляксандар Бабаскін** удакладніў у начальніка Меха **Ўладзімера Галашкі**, ці была размова з матывацыяй «альбо выбары, альбо праца» і атрымаў станоўчы адказ. Справу перанесьлі на 22 жніўня.

### 6 жніўня

#### Менск

Судзьдзя Вярхоўнага суду **Валянціна Кулік** адмовілася прызнаць незаконнымі дзеяньні Мін’юсту, які не зарэгістраваў **«Рух «За Свабоду»** на падставе тэхнічнай памылкі ў гарантыйным пісьме арганізацыі, якая забясьпечвала юрыдычны адрас.

#### Ліда

Ва **Ўладзімера Круцікава** зь Ліды зьнялі адбіткі пальцаў. Сп.Круцікаў — сябра БНФ «Адраджэньне», уваходзіць у ініцыятыўную групу кандыдата ў дэпутаты **Станіслава Судніка** й цяпер займаецца зборам подпісаў за яго. С.Судніка міліцыянты дапыталі раней.

#### Воранава

У Забалаці (Воранаўскі раён), дапыталі актывіста дэмакратычнага руху **Віталя Куплевіча** і зьнялі ў яго адбіткі пальцаў. В.Куплевіч не належыць ні да якой партыі.

#### Кобрынь

Актывіст партыі БНФ **Аляксандар Мех** атрымаў адказ на сваю скаргу на імя кіраўніка КДБ па Берасьцейскай вобласьці. Ён скардзіўся на дзеяньні кіраўніка мясцовага КДБ **Андрэя Баська**. У адказе за подпісам намесьніка начальніка ўпраўленьня **Дзядкова** гаварылася, што «паводле выкладзеных у скарзе фактаў была праведзеная службовая праверка. У выніку парушэньняў дзейнага заканадаўства ня выяўлена».

### 7 жніўня

#### Менск

Міліцыянты ўварваліся ў кватэру на вул.Караля, дзе знаходзіліся лідэры незарэгістраванага «Маладога фронту» **Зьміцер Дашкевіч**, **Артур Фінькевіч**, **Кася Галіцкая**, **Павал Кур’яновіч** і трое непаўналетніх. Міліцыянты выбілі двое дзьвярэй, матывуючы свае дзеяньн тым, што ў іх ёсьць інфармацыя, нібыта ў кватэры знаходзіцца труп. Трупа не знайшлі, але ўсіх затрымалі і адвезьлі ў РУУС Маскоўскага раёну. Пазьней Дашкевіча і Фінькевіча асудзілі на 7 сутак арышту. Абодва адразу абвесьцілі галадоўку.

#### Віцебск

Сьледчы КДБ выклікаў незалежную журналістку **Алену Сьцяпанаву**. Яе дапыталі ў якасьці сьведкі па так званай справе лістоў з пагрозамі ад імя незарэгістраванай арганізацыі РНЕ. Сьледчага цікавіла, дзе і пры якіх абставінах журналістка бачыла гэтыя лісты, а таксама якія яна ведае праваабарончыя арганізацыі. Праз тэлефон запрашэньне наведаць Упраўленьне КДБ атрымаў і незалежны журналіст **Вадзім Баршчэўскі**.

### 8 жніўня

#### Менск

Суд Маскоўскага раёну даў актывісту кампаніі «Эўрапейская Беларусь» **Паўлу Кур’яновічу** 15 сутак штрафу. Яго затрымалі разам з шасьцю актывістамі незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт» днём раней.

Міліцыянты абвінавацілі Паўла ў нецэнзурнай лаянцы.

**СП**







# Арабскія праекты разбудовы Менску

У красавіку сёлета ў Менск прыяжджала дэлегацыя з Аману: высьветлілася, што шэйхі хочуць пабудаваць што-небудзь у Менску. Гарадзкія ўлады ня сталі адмаўляць дарагім гасьцям у магчымасьці патраціць свае капіталы і прапанавалі ім пад забудову некалькі ўчасткаў. У прыватнасьці, квартал між вуліцамі Багдановіча, Купалы і Сьвіслаччу, дзе цяпер разьмяшчаецца Другая клінічная бальніца і выставачны комплекс «Белэкспа».

Праект распрацоўвае ангельскае архітэктурнае бюро Chapman Taylor. Мяркуецца пабудаваць у раёне моста праз Сьвіслач па вуліцы Купалы бізнэс-цэнтар, а на месцы сёньняшняга шклянога павільёну «Белэкспа» — чарговы пяцізоркавы гатэль. Што будзе з карпусамі Другой клінічнай бальніцы, сярод якіх ёсьць і пабудовы былога Троіцкага манастыру базыліянак, пакуль незразумела. Цалкам магчыма, што яго захаваюць.

Яшчэ адзін магчымы аманскі праект у Менску — забудова раёну ў межах вуліцаў Багдановіча, Кісялёва, Куйбышава і Камуністычнай. Будынкі, якія існуюць у тых кварталах, будуць зьнесеныя. На іх месцы хочуць пабудаваць бізнэс-цэнтар і цэлы комплекс жылых дамоў. Найхутчэй, што забудоўвацца будзе тэрыторыя заводу «Гарызонт».

Ну і трэці інвэстыцыйны праект, які прапанавалі сябры Султаната Аман — гэта забудова тэрыторыі у межах вуліцаў Чырвонаармейская — Першамайская і рэчкі Сьвіслач. З вынасам станкабудаўнічага заводу імя Кірава і зносам будынкаў, якія там ужо ёсьць.

Таксама ёсьць зьвесткі пра тое, што на скрыжаваньні вул.Леніна і Кірава, ля стадыёну «Дынама», мае паўстаць 34-павярховы гатэль, збудаваны на замову кампаніі Al Qudra з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. Кошт пабудова будзе $250 млн, паўстаць гатэль мае да 2010 году.

**Паводле dariuss.livejournal.com**




**1. Праект кварталу між вуліцамі Багдановіча, Купалы і Сьвіслаччу.**
**2. Гатэль «Дынама».**
**3. Так на праекце выглядае забудаваная вуліца Чырвонаармейская.**
**4. Забудова раёну ў межах вуліцаў Багдановіча, Кісялёва, Куйбышава і Камуністычнай.**



# Дажынкі ў Ліпічне

Рэпартаж **Андрэя Лянкевіча.**

Дажынкі — даўняе сьвята ўдзячнасьці. Нашыя продкі дзякавалі за ўрадлівасьць полю і тым багам, якія, на іхную думку, тую ўрадлівасьць забясьпечылі. Спарыш, Жытняя матка, Дзед, Спарыньня — па-рознаму клікалі тых багоў у розных кутках Беларусі. Іх выявы рабілі з апошняга зжатага снапа, упрыгожвалі, ахвяравалі ім. Водгульле тых даўніх часоў — абрад дажынак — пабачыў карэспандэнт «НН» на Шчучыншчыне. 8 жніўня ў вёсцы Ліпічна з апошняга жыта зрабілі Дзеда. Ля яго на пожню паклалі хлеб з сольлю. Гучалі жніўныя песьні.











# Міліцыя шукае Янку Філістовіча?





Сталічная міліцыя працягвае пошук сям'і, якая прысутнічала на канцэрце з нагоды Дня Незалежнасьці і можа мець важную для сьледзтва інфармацыю па справе выбуху.

Апроч гэтага, ГУУС Менгарвыканкаму шукае мужчыну, які, паводле сьведчаньняў відавочцаў, зьявіўся на месцы знаходжаньня першага выбуховага прыстасаваньня. Міліцыя распаўсюдзіла і фатаробат гэтага чалавека (першы партрэт). А цяпер параўнайце яго з удзельнікам Амэрыканскага дэсанту 1951 г., кіраўніком узброенай антысавецкай групы пад Маладэчнам Янкам Філістовічам (партрэт, створаны Алесем Пушкіным). Здымкі параўноўваў

**Антось Каберац**

## «Пятае Эвангельле» Карнэлія Консэка

**З 15 ліпеня ў Глыбоцкім цэнтры культуры знаходзіцца фотавыстава Карнэлія Консэка «Пятае Эвангельле».** Ведаем, што існуюць чатыры Эвангельлі, а што ж такое Пятае Эвангельле? Адказ просты — гэта ўсё тое, што мы бачым ці на што не зважаем.

«Пятае Эвангельле» створана Богам і рукамі чалавека. Гэта кніга нашага штодзённага чытаньня. Стваральнік фатаздымкаў — манах Ордэну Місіянэраў Божага Слова. Ён працаваў чатыры гады ў Рыме, а з 1998-га працуе ў Беларусі. Пра сваю выставу Карнэлій Консэк адзначыў наступнае: «Часта людзі не заўважаюць тых незвычайных рэчаў, што знаходзяцца побач. Але калі робіш здымак і ставіш яго ў рамку — адкрываецца іншы сьвет. Я хачу паказаць той цуд прыроды, тую прыгажосьць, побач зь якой мы жывем, але праходзім міма». Фатограф рэдка здымае чалавека, каб не пагаварыць зь ім, за кожным кадрам ёсьць жыцьцёвая гісторыя,



**«Віталік, я цябе разумею». Радашкавічы, 2006. Фота Карнэлія Консэка.**

Вось фота дзяцей з Баранавіцкага дзіцячага дому, дзьвюх рэкаў, якія ўтвараюць крыж, жанчыны ў 102-і год нараджэньня, задумлівы хлопец пад «смуткуючым» Хрыстом, першыя кропелькі-сьлёзкі на вярбіне.

**Кацярына Церашкова, Навапалацак**

## Помнік случчакам у Нямеччыне

**Грамада беларускіх студэнтаў з «Польшчы Беларуская нацыянальная памяць» (БНП) езьдзіць па беларускіх мясьцінах Эўропы. З Швайцарыі яна накіравалася ў Баварыю і Бадэн-Вюртэмбэрг.**

Па дарозе вырашылі заехаць у ваколіцы возера Лютэнзэе ў Нямеччыне, недалёка ад мяжы. У беларускай бібліятэцы імя Скарыны ў Лёндане да нас патрапіў здымак помніка ў гонар Слуцкага Збройнага Чыну. Аднак не было дакладнай інфармацыі ні пра месца, дзе помнік знаходзіўся, ні пра тое, ці ён увогуле захаваўся.

Помнік, усталяваны ў 1948 г., удалося адшукаць. Знак беларускай прысутнасьці на няроднай зямлі ўзрушвае. Хочацца сказаць вялікі дзякуй немцам, якія захоўваюць чужыя помнікі. Раніцай давялося папрацаваць над прыборкай дзялянкі і ачысткай падмурку. Пасьля адбылася кароткая акцыя ўшанаваньня і рушылі далей у Мюнхэн. У сталіцы Баварыі адбылася сяброўская сустрэча зь мясцовымі беларусамі.



**Помнік, усталяваны ў 1948 г., удалося адшукаць.**

У Баварыі, сярод іншага, мы наведалі могілкі Waldfriedhof у Мюнхэне, дзе пахаваны айцец Уладзімер Салавей, які загінуў у аўтамабільнай аварыі ў 1974 г.

Далей нашая грамада накіравалася ў Штутгарт. Тут зь сярэдзіны 1940-х да 1991 году жыў Зьміцер Касмовіч — нацыянальны дзеяч у часе нямецкай акупацыі Беларусі.

Месца пахаваньня З.Касмовіча знаходзіцца на могілках Hauptfriedhof недалёка ад месца, дзе ён жыў і дзе працягвае жыць яго ўдава Надзея Касмовіч-Міцкевіч, дарэчы, пляменьніца Якуба Коласа.

**Прысутны**

## Віня-Пых у Глыбокім

**27 ліпеня ў касьцёле Сьвятой Тройцы ў Глыбокім адбылася прэзэнтацыя кнігі Мілна «Віня-Пых» у беларускамоўным перакладзе Віталя Воранава.**

Аналягічныя прэзэнтацыі адбыліся ў Маладэчне, Бярозе, Гомелі, а таксама за мяжой — у Вільні, Познані, Лёндане і Празе.

Віталь Воранаў нарадзіўся ў Глыбокім, тут быў ахрышчаны, тут жа скончыў 5 класаў у СШ №2. У дванаццацігадовым узросьце ён з бацькамі пераехаў у Польшчу (Познань). Там жыве і працуе па сёньняшні дзень.

У Польшчы В.Воранаў далучыўся да суполкі беларусаў-перасяленцаў, мэтай дзейнасьці якіх зьяўляецца захаваньне роднай мовы і культуры, выданьне беларускамоўных кніг і часопісаў, супрацоўніцтва з аналягічнымі суполкамі беларусаў у Чэхіі, Англіі, ЗША.

Задума перакласьці «Віня-Пыха» Мілна — у Віталя зьявілася сама сабой, калі ён пачаў чытаць яе ў арыгінале. Трэба адзначыць, што з часу першага выданьня кнігі Мілнам у 1926 г., яна ні разу не перакладалася на беларускую мову.

Праца над перакладам заняла год, і беларускі «Віня-Пых» пабачыў сьвет да Калядаў 2007 г. (дарэчы, арыгінал таксама быў выдадзены да Калядаў і раскуплены за тыдзень). Ангельскае выдавецтва, якое мела спадчынныя аўтарскія правы А.Мілна з разуменьнем паставілася і значна зьнізіла кошт выплатаў; гэта дазволіла зрабіць цану кнігі даступнай.

Беларускі «Віня-Пых» праілюстраваны арыгінальнымі малюнкамі мілнаўскага выданьня. Пра тое, чаму ўсім знаёмы савецкі «Винни-Пух» стаў «Віня-Пыхам» (а не «Віньні-Пухам», напрыклад), расказвае перакладчык ва ўступе: «Ўінні-Важны-Пу (даслоўнае з англ. мовы Winne-the-Pooh) паведаміў мне з адказнасьцю, што дзеці ўсяго сьвету сябруюць з такімі самымі Медзьвядкамі, і тыя маюць вельмі падобныя імёны. Гэтак дзеткі з Гішпаніі сябруюць зь Вінны-Пухам, дзеткі са Швэцыі — з Нальле-Пухам, дзеткі з Латвіі — зь Віньнійс-Пуксам, дзеткі з Расеі — зь Віньні-Пухам, дзеткі з Польшчы — з Кубусем Пухаткам, а з Чэхіі з Мэдвідкам Пу...» Цяпер, дзякуючы намаганьням Віталя Воранава, дзеткі-беларусы маюць магчымасьць пазнаёміцца з НАШЫМ, БЕЛАРУСКІМ мядзьведзікам, якога клічуць Віня-Пых!

**Кацярына Церашкова, Навапалацак**

# Калі сьвяткаваць дзень археоляга?

**Мне, выкладчыку археалёгіі, студэнты іншым разам задаюць пытаньне: «Ці ёсьць Дзень археоляга?»**

Самадзейны 15 жніўня. Сьвята караніцца ў савецкіх часах. Вядомы археоляг Уладзіслаў Раўданікас меў звычку піць у адзіноце. Калі падначаленыя пыталіся пра нагоду, ён прыдумляў якое-небудзь сямейнае сьвята. Нарэшце, усё было вычарпана, і ён сказаў: «Сёньня буду піць ня толькі я, але і ўсе мы! Сёньня — Дзень археоляга!»

Выходзіць, узьнікненьне сьвята далекаватае ад навуковых пачаткаў. Можа, лепш было б зьвязваць узьнікненьне сьвята зь якой знамянальнай датаю ў гісторыі археалёгіі?

324 год. Рымскі імпэратар Канстанцін Вялікі (272—337) абвяшчае хрысьціянскую веру адзінаю правільнай і загадвае ўзьвесьці ў Бэтлееме і ў Eрусаліме храмы. Але патрэбныя сымбалі веры, рэліквіі… Найгалоўнейшай рэліквіяй маглі б стаць рэшткі крыжа, на якім прыняў пакуты Збавіцель. Узьнікла неабходнасьць адшукаць гэты крыж. Знайшоўся адзін стары чалавек, які памятаў, дзе знаходзіўся Крыж Госпада. Гэта была пячора ў Палестыне, заваленая будаўнічым сьмецьцем. Пачалі пласт за пластам здымаць насыпны грунт. І знайшлі.

Частку крыжа адвезьлі ў Канстантынопаль, а другую перадала ў храм Узьнясеньня Госпада. Адбылося гэта 27 верасьня. Гэты дзень адзначаецца праваслаўнымі як сьвята Ўзьвіжаньня.

З пазыцыі сучаснай навукі тут будуць усе элемэнты археалягічнага дасьледаваньня: выведка на мясцовасьці з апытаньнем насельніцтва, паслойная распрацоўка культурнага пласту, атрыбутацыя знаходкі, мерапрыемствы па захаваньні і музэефікацыі помніка.

Трапна было б прымеркаваць сьвята да 27 верасьня, калі большасьць археолягаў завяршае палявыя работы. Але ў гэтых падзеях нямала ёсьць і легендарнага. Таму маем прапанаваць гэтую дату для дня народзінаў царкоўнай археалёгіі і пашукаем іншыя, сьвецкага паходжаньня.

Заходняя Эўропа. Францыя. Тут 9 сьнежня 1717 г. нарадзіўся Ёган Ёахім Вінкельман, пачынальнік эўрапейскай археалягічнай навукі. Дзень народзінаў гэтага навукоўца — 9 сьнежня — заходнеэўрапейскія археолягі сьвяткуюць як дзень народзінаў эўрапейскай археалёгіі.

Хто-ніхто з нашых калегаў у Літве прапануе прымеркаваць Дзень археоляга да заснаваньня Часовай археалягічнай камісіі (11 траўня 1855 г.), да дня народзінаў Яна Пузыны — аўтара першага прафэсійнага падручніка па археалёгіі Літвы (18 верасьня 1905 г.), і нават да дня народзінаў Яўстафія Тышкевіча, заснавальніка Віленскага музэю старажытнасьцяў (18 красавіка 1814 г.). Хоць апошні нарадзіўся ў Лагойску і вядомы як дасьледчык беларускіх старажытнасьцяў.

Першым сьведчаньнем аб археалёгіі ў Беларусі можна лічыць дакумэнт, які фіксуе пачатак першых раскопак, або які дае права на іх правядзеньне. Ён быў выдадзены ў Віленскім унівэрсытэце Зарыяну



**Зарыян Далэнга-Хадакоўскі.**

Далэнгу-Хадакоўскаму (псэўданім Адама Чарноцкага) 26 сьнежня 1818 г. Дакумэнт захоўваецца ў Менскім абласным краязнаўчым музэі (Маладэчна). Напісаны ён на пэргамэнце на трох мовах: лаціне, польскай і расейскай.

Далэнга-Хадакоўскі праводзіў дасьледаваньні ў Беларусі, ва Ўкраіне, у Расеі. Ён быў першым дасьледчыкам Старой Ладагі — даўняй сталіцы Русі. Вывучаў замчышчы і курганы ў ваколіцах Бабруйску, Берасьця, Віцебску, Ваўкавыску, Гомелю, Горадні, Ліды, Магілёва, Навагрудку, Пінску, Полацку, Рагачова, Слоніму, Турава. Пра яго хораша адгукаўся гісторык Мікалай Карамзін. «Вядомы вышукальнік старажытнасьцяў», — пісаў пра яго расейскі паэт Аляксандар Пушкін. Далэнга-Хадакоўскі, упершыню перанёс «сыстэму дасьледаваньняў зь пісьменнай вобласьці на зямлю і яе помнікі». А гэтае дзеяньне вартае Вінкельмана — заснавальніка эўрапейскай археалёгіі.

Сёньня ў краіне названыя 27 прафэсійных сьвятаў. Чаму б не зрабіць прафэсійным сьвятам і Дзень археоляга? Унёсак археолягаў у станаўленьне беларускай навукі неаспрэчны. Стараньнямі іх, недзе 25—30 чалавек, дасьледуюцца найбольш раньнія і найбольш працяглыя па часе пэрыяды гісторыі Беларусі, выпушчаны не адзін дзясятак манаграфій, чатыры тамы «Археалёгіі Беларусі», Энцыкляпэдыя «Археалёгія і нумізматыка Беларусі», створаныя тры археалягічныя музэі (у Берасьці, Тураве і ў Інстытуце гісторыі НАН).

Думаецца, сваёй нялёгкай працай людзі гэтай прафэсіі заслужылі права на прафэсійнае сьвята, якое і належыла б адзначыць 26 сьнежня, праводзіўшы ў гэты дзень навуковыя слуханьні па выніках палявых працаў.

Ну, а як быць з 15 жніўня? Застанецца на побытавым узроўні, як рэліквія мінулай эпохі…

**Лявон Калядзінскі**

# Паўстагодзьдзя Манаева

Актор, безь якога не ўявіць сабе беларускага тэатру, сьвяткуе юбілей. 7 жніўня яму споўнілася 50 гадоў. Нават калі б Манаеў сыграў аднаго Мікіту Зноска ў пінігінскіх «Тутэйшых», ён застаўся б у гісторыі Купалаўскага.

А Манаеў сыграў дзясяткі бліскучых роляў. Ён іграў як бог побач зь незабыўнай Стэфаніяй Станютай у «Гаральд і Мод», і людзі плакалі. Сёлета ж ён непаўторна сыграў Кручкова ў «Пінскай шляхце» (**на фота**) ў пастаноўцы Мікалая Пінігіна паводле Дуніна-Марцінкевіча.

21 верасьня ў Купалаўскім тэатры пройдзе сьвяточная імпрэза з нагоды 50-годзьдзя Віктара Манаева.

**МБ**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Be Free: Свабода пад дажджом і сонцам

**Працяг са старонкі 1.**

Львоў сустрэў лужынамі і пахмурным небам. Але цяжка выказаць уражаньні ад гэтага места. У вочы кідаецца яго натуральнасьць, адсутнасьць штучнага бляску. Жывы эўрапейскі горад. І суцэльная ўкраінская мова — з вуснаў мінакоў і прадавачак у крамах, з шыльдаў і бігбордаў.

Музыка і ды-джэй Аляксандар Памідораў адкрыў Be Free словамі падзякі Ўкраіне за тое, што дае беларусам магчымасьць ладзіць буйныя фэсты. Ягоны покліч «Слава Ўкраіне!» прагучыць яшчэ ня раз. Залуналі бел-чырвона-белыя ды жоўта-блакітныя сьцягі.

Пачатак быў нешматлюдным — B:N: ды Partyzone выступалі ў прысутнасьці некалькіх соцень гледачоў. Сытуацыя пачала выпраўляцца са зьяўленьнем украінскага гурту «Інкунабула». Прыемна зьдзівілі і французы з Vladivostok. У некалькіх песьнях яны ўплялі ў радкі лёзунг «Жыве Беларусь!». Прычым з кожным разам выклік набліжаўся да ідэальнага па гучаньні варыянту. Як і «дзякуй» пасьля кожнай песьні. З падачы Памідорава публіка на сыход французаў пачала скандаваць «мэрсі!». І пачула ў адказ «час сядаць за стол».

Лявон Вольскі з гуртом Zet граў пад дажджом. Зь першых песень падалося, што голас слаба слухаецца Вольскага, але звышэмацыйна выкананае «Востае джала» вярнула ўсё на свае месцы. Скончалі фэстывальны дзень украінскія «Гайдамакі».



Пад WZ-Orkiestra танчылі ўсе.

АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

Дождж лупіў, але відовішча сотняў парасонаў і аголеных цэлаў у сьвятле пражэктараў, што адначасова падскоквалі ў рытм музыкі, прымушала самога забыць на мокрыя ногі.

Другі дзень фэстывалю пачаўся выступам фолькавых гуртоў на плошчы Рынак. P.L.A.N., «Джамбібум» і «Яр» здолелі разварушыць людзей і падрыхтавалі глебу для «Старога Ольсы». Тут ужо й танчыць пачалі. З гаўбцоў старасьвецкіх дамоў танцы фатаграфавалі цікаўныя месьцічы.

Зьміцер Вайцюшкевіч згадаў падзеі ў Грузіі. «Я не люблю вайну і не хачу ведаць, што гэта такое», — сказаў музыка. І прасьпяваў некалькі песьняў з выразнымі каўкаскімі матывамі. Украінскія ж песьні разам з Вайцюшкевічам сьпявала паўтысячы чалавек.

Тым часам у Парку культуры імя Хмяльніцкага гучаў рок. «Крама» і сьпявала «Камэнданта». Ігар Варашкевіч адкрыў сакрэт шэрасьці беларускай рэчаіснасьці — «Над намі пануе камэндант». Пачуўшы «Гэй там, налівай», большасьць прысутных спакусілася. Балазе побач працавалі намёты зь півам, зварaным на львоўскай вуліцы імя Джорджа Вашынгтона.

Варашкевіча зьмяніў Вячаслаў Корань з «Уліcам», пасьля быў «Neuro Dubel». Скончылі фэст украінскія зоркі «Тартак».

На гукі музыкі да сцэны сьцягнулася самая розная публіка. Найбольш было моладзі, заўважаліся старыя хіпаны (самы калярытны нагадваў пастарэлага Джона Ленана інкогніта). Старыя бабулі на роўных з маладымі танчылі пад Вайцюшкевіча. Дзядзька за пяцьдзясят у цюбэцейцы і на мыліцах скакаў пад рок. У натоўпе на плячах у бацькоў сядзелі дзеці. Нават вясельная пара завітала на плошчу і станчыла зь бел-чырвона-белым і жоўта-блакітным сьцягамі. Па-над усім панаваў дух разьняволенасьці і непасрэднасьці, які ў Беларусі даводзілася адчуваць хіба на сярэднявечных фэстах у Навагарадку. Для сябе асабіста я адкрыў яшчэ адно месца, куды варта наведацца, каб глытнуць гэтага самага вольнага паветра.

**Сямён Печанко, Львоў-Менск**

## СЬЦІСЛА

### Апублікаваны дзёньнік Панамарэнкі

У часопісе «Нёман» пабачылі сьвет дзёньнікі Панцеляймона Панамарэнкі, які ў 1938—1948 гг. быў першым сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі. П.Панамарэнка меў рэпутацыю «зьбіральніка» беларускіх земляў. Ён браў непасрэдны ўдзел ва ўзьяднаньні Заходняй Беларусі й БССР у 1939 г., ён пераканаў Сталіна ў тым, што Палесьсе зь Берасьцем і Пінскам мусіць быць у складзе БССР. У дзёньніках апісваюцца шматлікія сустрэчы Панамарэнкі з Сталіным. Каштоўныя запісы найперш тым, што нямногія прадстаўнікі савецкай партнамэнклятуры вялі дзёньнікі ў той час.

### Беларускі мульцік пра іншаплянэцянаў выйдзе восеньню

Аніматары «Беларусьфільму» сканчаюць працу над новай мультыплікацыйнай стужкай пра касьмічных ратаўнікоў «Плюс і мінус». Працягласьць новага мультфільму — 13 хвілінаў. Над малюнкамі кожнага кадру (а іх у стужцы больш за 70 тысячаў) працавалі 20 мастакоў-прамалёўшчыкаў. Праца будзе завершаная ўвосень.

### У Зэльве ўшанавалі памяць Геніюш

9 жніўня, у дзень нараджэньня Ларысы Геніюш, у Зэльве зьбіраліся прыхільнікі яе творчасьці. Штогод у гэты дзень замаўляецца імша па Ларысе Геніюш у царкве, якая стаіць якраз насупраць дому, дзе яна жыла ў Зэльве. На могілках, дзе пахаваныя Ларыса Геніюш і яе муж Янка, сёлета сабралася больш за 60 чалавек.

Геніюш успаміналі паэты Данута Бічэль, Міхась Скобла. Намесьнік пасла Чэскай Рэспублікі Герман Хромы сказаў, што неафіцыйна прабачаецца за чэхаславацкіх камуністаў, якія ў 1948 г. перадалі Ларысу Геніюш, якая жыла ў Празе, савецкім уладам. Ён расказаў пра задуму ўсталяваць памятную дошку на доме ў Празе, дзе калісьці жыла Ларыса Геніюш.

### Ствараецца электронны даведнік, прысьвечаны Радзівілам

Інфармацыйна-пошукавую сыстэму пра род князёў Радзівілаў ствараюць архівісты Беларусі, Украіны, Літвы, Польшчы, Расеі і Нямеччыны. Галоўная мэта гэтага праекту — сабраць у архівах і бібліятэках усю інфармацыю пра род Радзівілаў.

### У Гарошкаве паставілі помнік Сысу

9 жніўня ў вёсцы Гарошкаў Рэчыцкага раёну ўстаноўлены помнік на магіле паэта Анатоля Сыса. Помнік выраблены з чырвона-чорнага граніту. У верхнім правым куце помніка — цэрновае гняздо, у якім сядзяць птах. Унізе — белы марморовы камень у выглядзе чыстага аркуша, які азначае, што паэт шмат мог бы яшчэ напісаць. На тыльным баку помніка чатырохрадкоўе Сыса. Зрабіў помнік скульптар Генадзь Лойка. Сродкі на яго сабрала грамадзкасьць.

**СМ паводле радыё «Свабода», БелаПАН, БЕЛТА**

# Ёсьць горад

## перанасычаны беларускім жыцьцём

Гэта Варшава. З налібоцкім варшавяком **Зьмітром Гурневічам** гутарыць **Наталка Бабіна**.

### Манаполію на беларускія імпрэзы трымаюць палякі

**«Наша Ніва»: Ці многа беларусаў жыве цяпер у Варшаве?**

**Зьміцер Гурневіч:** Паводле розных падлікаў тут знаходзяцца некалькі тысячаў беларусаў — такія зьвесткі агучыла мэрыя Варшавы. На ўліку ў пасольстве — больш за 500 грамадзянаў Беларусі, якія тут галасуюць.

**«НН»: Ці Вы асабіста адчуваеце сябе беларусам, ці ўжо грамадзянінам глябалізаванага сьвету?**

**ЗГ:** Апошнім часам многа думаю пра гэта. Дакладна не адчуваю сябе палякам, хоць маю польскія карані. Мне вельмі падабаецца Польшча, я вельмі рады, што апошнім часам яна дынамічна і хутка разьвіваецца, мае многа посьпехаў, людзі робяцца ўсё больш багатымі. Але я не зьбіраюся адмаўляцца ад беларускага грамадзянства ніколі, нават тады, калі б атрымаў польскі пашпарт. Я адчуваю сябе беларусам, мне гэта падабаецца, аднак мне найбольш блізкая такая пазыцыя, якая цяпер пашыраная ў многіх краінах сьвету: ня так важна, якой ты нацыянальнасьці. Можна сказаць, што я грамадзянін сьвету, які мае беларускія погляды і ганарыцца тым, што нарадзіўся ў Беларусі. Але я не скажу, што я так ужо моцна прывязаны да *зямлі*, што адчуваю настальгію. У мяне вялікая беларуская бібліятэка, многа беларускіх дыскаў, я гавару са сваімі сябрамі і дзяўчынай толькі па-беларуску... Але канчатковы адказ на пытаньне, ці я беларус, ці я паляк, ці я грамадзянін сьвету, мне цяпер нават не патрэбны.

**«НН»: Вы кажаце, што цяпер у Варшаве многа беларусаў. Ці адчуваецца іх прысутнасьць? Ці ёсьць тут беларускае культурнае жыцьцё?**

**ЗГ:** Беларуская прысутнасьць тут адчуваецца бадай хваляmі. У 2001 г., калі я прыехаў у Варшаву, тут дзейнічаў Інстытут беларускай культуры, які часта ладзіў імпрэзы. Пазьней, як беларусы гэта любяць, усе між сабой пасварыліся і імпрэзы скончыліся. Потым быў створаны фонд «Беларуская ініцыятыва». Гэтая арганізацыя актыўна працавала ў 2004—2007 гг.: амаль штотыдзень тут адбываліся падзеі. Прычым вось што цікава: калі сюды я прыехаў, такія імпрэзы рабіліся для беларусаў, а цяпер на іх прыходзяць пераважна палякі.

**«НН»: Чаму так?**

**ЗГ:** Бо іх ужо было зашмат. Я амаль не хаджу на канцэрты беларускіх гуртоў, бо ўжо на памяць ведаю ўсе беларускія песьні.

**«НН»: А што Вам цікава? Куды Вы ходзіце?**

**ЗГ:** Я выбіраю больш экзатычныя справы. Праўда, цяпер у мяне зусім мала часу, бо маю дзьве працы, але калі час ёсьць, то выбіраю нешта скандынаўскае або афрыканскае. Я вельмі люблю Ісьляндыю, удзельнічаў у ісьляндзкім студэнцкім клюбе ў Варшаве. Да слова, браў удзел і ў яго арганізацыі.

**«НН»: І Лакснэса, можа, любіце?**

**ЗГ:** Так, я маю ягоныя кніжкі, праўда, у перакладзе на ангельскую. І трынаццацігадовую акулу даводзілася пакаштаваць, калі мы зь сябрамі былі ў Ісьляндыі. Пачуцьцё такое, ніби ясі хлёрную вапну! Але вернемся да беларускіх справаў: у Варшаве адчуваецца перанасычанасьць беларускім жыцьцём. Беларускіх падзеяў шмат. Многа робіць у гэтым кірунку і беларускае пасольства. Вось ужо другі год яны вельмі актыўна дзейнічаюць. Тут працуе вельмі добры аташэ па культуры, Тадэвуш Стружэцкі. Пасольства ладзіць цікавыя канцэрты. На апошнім з іх выступаў хор імя Цітовіча, і там сабраліся больш за 2000 чалавек. Гледачы былі проста ў захапленьні! 2000 чалавек для Варшавы — гэта вельмі многа. Тут на канцэрты супэрпапулярных поп-гуртоў зьбіраецца столькі.

> Раней на беларусаў — музыкаў, мастакоў хадзілі, каб «пашкадаваць ахвяраў Лукашэнкі», а цяпер — бо гэта сапраўднае мастацтва, бо гэта цікава.

У Варшаве выстаўляецца мноства сучасных беларускіх мастакоў. Прычым некаторыя з выставаў арганізуе пасольства, некаторыя — прыватныя галерысты.

Самі палякі прадусуюць беларускіх музыкаў. Яны арганізуюць канцэрты для палякаў, прычым гэта робіцца на камэрцыйнай аснове. Увогуле, можна сказаць, манаполію на беларускія імпрэзы цяпер маюць палякі. Яны прывозяць сюды немцаў, амэрыканцаў, вось Дзіму Білана павінныя былі прывезьці — прывозяць і беларусаў. NRM, «Крама» — яны тут папулярныя. Раней гэта рабілася ў такім палітычным ключы, пад лёзунгам «пашкадуйма бедных беларусаў, ахвяраў Лукашэнкі», а цяпер гэта робіцца ў ключы мастацкім. Раней беларусаў тут выстаўлялі і папулярызавалі таму, што, маўляў, яны ня могуць зрабіць гэта ў Менску, а цяпер — таму што гэта сапраўднае мастацтва, таму што гэта цікава.



**Зьміцер Гурневіч**

журналіст. Вось ужо сем гадоў ён жыве ў Польшчы. Прыехаў са сваіх Налібокаў (каля пушчы, Стаўпецкі раён) вучыцца ў Варшаўскім унівэрсытэце імя кардынала Вышыньскага. Працуе на «Польскім радыё» і на «Белсаце».

### У меру магчымасьцяў

**«НН»: Цяпер у Варшаве працуе шмат СМІ, якія вяшчаюць на Беларусь. Ці спраўляюцца яны са сваімі задачамі?**

**ЗГ:** Цяжкае пытаньне. На сёньня ў Польшчы працуюць радыё «Рацыя», «Белсат», «Польскае радыё для замежжа», «Эўрапейскае радыё для Беларусі». Іх некарэктна параўноўваць, бо яны вельмі розныя. Думаю, усе пералічаныя мэдыі працуюць у меру сваіх магчымасьцяў. Я магу больш падрабязна расказаць пра «Польскае радыё для замежжа», дзе я працую. Яно папулярызуе Польшчу, польска-беларускія дачыненьні. Вяшчаем мы на ўсю Беларусь. Колькі чалавек нас слухае — сказаць цяжка. Калі выкарыстаць мэтодыку Бі-Бі-Сі, што адзін чалавек, які напісаў ліст, прэзэнтуе трыста слухачоў, то «Польскае радыё для замежжа» можа разьлічваць на больш як дзясятак тысячаў слухачоў.

### Стэрэатыпы і як зь імі змагацца

**«НН»: Ці шмат увагі Беларусі надаюць польскія СМІ?**

**ЗГ:** Так. Сапраўды палякі цікавяцца Ўсходняй Эўропай, гэта ў іх ёсьць. Кожная з галоўных польскіх газэтаў амаль штодня зьмяшчае матэрыялы пра Беларусь. Іншая рэч, што гэта за матэрыялы. Я часта, прачытаўшы іх, абураюся, пасылаю ім мэйлы, даводжу, што яны памыляюцца... Бо зь іхнай інфармацыі складаецца ўражаньне, што Беларусь — гэта нейкая Паўночная Карэя. Пераважаюць навіны з нэгатыўнай афарбоўкай. На ўсходзе, маўляў, ня можа быць нічога добрага. Жыцьцё малюецца толькі адной фарбай.

**«НН»: На Ваш погляд, гэта сьвядомая фальсыфікацыя ці такі мэнтальны падыход?**

**ЗГ:** Вядома ж, не фальсыфікацыя. Палякі шчыра зычаць беларусам свабоды й посьпехаў. Але пэўныя стэрэатыпы пра тое, што на ўсход ад польскай мяжы адзін нэгатыў, сапраўды існуюць. Антырасейскія настроі існуюць, і пад гэтыя антырасейскія настроі часам трапляюць і беларусы, але ўсё менш і менш. Па праўдзе кажучы, беларусы ня маюць у Польшчы дрэннага іміджу, бо пра нас яшчэ мала ведаюць як пра нацыю. Пакуль нам толькі спачуваюць.

Нязноснасьць больш характэрная для старэйшага пакаленьня, малады больш адкрытыя для сьвету. Асабіста мне ў Польшчы прасьцей быць беларусам, чым у Беларусі. Калі палякі пачалі самі шмат езьдзіць па сьвеце ня толькі як турысты, але і ў пошуках працы, яны зразумелі, што значыць быць іншаземцам і змагацца са стэрэатыпамі. Некалі сьвет захоча шчыльна супрацоўнічаць зь Беларусьсю, і важна, каб гэтыя людзі ведалі ня толькі пра Чарнобыль, Лукашэнку й танную гарэлку.

> Некалі сьвет захоча супрацоўнічаць зь Беларусьсю, і важна, каб гэтыя людзі ведалі ня толькі пра Чарнобыль, Лукашэнку й танную гарэлку.

> Жыцьцё за мяжой беларусізуе беларусаў

### Замежжа пераварочвае сьвядомасьць

**«НН»: Ці многа вядомых, знакамітых беларусаў жывуць цяпер у Варшаве?**

**ЗГ:** Пазьняк жыве паміж Варшавай і Нью-Ёркам. Жыве ў Варшаве адзін з найвядомейшых беларускіх гісторыкаў Юры Туронак. Мастак Лёнік Тарасевіч час ад часу тут зьяўляецца. Многа вядомых людзей жывуць часова, выкладаюць ва ўнівэрсытэтах.

**«НН»: Ці існуе тут рэлігійнае беларускае жыцьцё?**

**ЗГ:** Так, у кляштары дамініканаў раз на месяц ладзіцца беларуская імша каталіцкага абраду. Вакол яе таксама гуртуюцца беларусы, прычым ня толькі каталікі, але і праваслаўныя, і атэісты — таму што там магчыма пагаварыць між сабой. Многа прыходзіць моладзі. Прычым моладзь часта далёкая ад беларускасьці, расейскамоўная. Бывае, ня ведаюць, хто такі Мілінкевіч, — а гэта ж пра многае сьведчыць, пагадзіцеся. Але жыцьцё ў замежжы так пераварочвае сьвядомасьць! Чалавек прыяжджае сюды абсалютна не падазраючы, што такое зь ім можа адбыцца. Адкрыцьцё сьвету памагае адкрыць сябе. Чалавек пачынае мяняцца, таму што людзі бачаць іншае жыцьцё, яны пачынаюць шукаць сваё месца. Беларусы пачынаюць прэзэнтаваць сябе як беларусы. Прыкладаў шмат. Ніколі ня бачыў, каб сюды прыехаў беларускамоўны беларус і адмовіўся ад сваёй беларускасьці. А вось каб расейскамоўны загаварыў па-беларуску і ўсьвядоміў сябе беларусам — колькі заўгодна.

**Гутарыла Наталка Бабіна**


Новая кніга сэрыі

«Кнігарня «НН»




**Быкаў, В. Сьцяна. — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008. — 350 с.**

шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў

# Узьлёт і падзеньне «сацыялізму з чалавечым тварам»

20 жніўня спаўняецца сорак гадоў уводу войскаў краінаў Варшаўскай дамовы ў братнюю Чэхаславаччыну. Піша **Вацлаў Шаблінскі.**


**Дубчак (зьлева), Касыгін і Брэжнеў пасьля прыніжальных перамоваў.**

20 жніўня спаўняецца сорак гадоў уводу войскаў краінаў Варшаўскай дамовы ў братнюю Чэхаславаччыну, які паклаў канец палітычнаму працэсу, вядомаму як «Праская вясна». «Праская вясна» цягнулася нядоўга, але менавіта яна найбольш паўплывала на перабудову ў СССР, «аксамітныя рэвалюцыі» ў Усходняй Эўропе. Што ж спарадзіла гэтую трагічную і кароткую драму?

Пачаткам камунізму ў Чэхіі лічацца падзеі лютага 1948 г., калі камуністы выціснулі сваіх супернікаў з ураду. Неўзабаве прэзыдэнт краіны Эдвард Бэнэш вымушаны быў саступіць сваю пасаду лідэру кампартыі Клемэнту Готвальду.

Камунізм у Чэхіі і Славаччыне ня быў чымсьці навязаным звонку. Ён абапіраўся на традыцыйныя, панславісцкія сымпатыі да Расеі, якія ўзьніклі яшчэ ў часы Аўстра-Вугоршчыны і ўзмацніліся падчас Мюнхэну і нямецкай акупацыі. Зь імі лічыліся і апанэнты чэскіх камуністаў. Адзін зь іх, Вацлаў Чэрны, пісаў: «Ад мяне не дачакаюцца непачцівых словаў на адрас Савецкай дзяржавы і яе кіраўнікоў».

Калі ж улічыць, што найбольш выбітныя чэскія і славацкія інтэлектуалы таго пэрыяду былі камуністамі, ня трэба зьдзіўляцца, што камуністычны пераварот не сустрэў сур'ёзнага супраціву.

Камуністы разгарнулі барацьбу з сваімі апанэнтамі. Найбольшую вядомасьць атрымаў сьмяротны вырак Міладзе Горакавай, дэпутату ад бэнэшаўскай партыі. Тым, каму пашчасьціла ўнікнуць сьмяротнай кары, пагражала высылка ў памежныя раёны або на ўранавыя капальні.

Рэпрэсіі закранулі ўрэшце і саміх арганізатараў. У 1954 г. да шыбеніцы быў асуджаны генсак КПЧ Рудольф Сланскі і яшчэ дзесяць высокіх партыйных функцыянэраў. Гэта быў самы вялікі на калькасьці сьмяротных прысудаў палітычны працэс ва Ўсходняй Эўропе. Сьмерць Сталіна, а за ім і Готвальда ў наступным годзе, здавалася, нічога не зьмяніла ў Чэхаславаччыне. Працягваліся палітычныя расправы. У 1955 г. на праскай плошчы паўстаў грандыёзны помнік «бацьку ўсіх народаў».

Між тым патрэбы ў пераменах узрасталі. Асноўнай праблемай стала відавочнае эканамічнае адставаньне краіны — у 1930-я адной з самых разьвітых краінаў сьвету — ад Захаду. Гэта пры тым, што ў параўнаньні са старэйшым братам чэхі заўсёды жылі больш заможна. Акрамя таго, існавала пытаньне аб рэабілітацыі ахвяраў палітычных рэпрэсій і адказнасьці за іх. Што тычыцца нацыянальнай праблемы, то Славаччына была пазбаўленая і ценю аўтаноміі, а яе сталіца Браціслава мела статус толькі абласнога цэнтру.


**Партызан Кірыла Мазураў выдаваў сябе ў Чэхаславакіі за пацярпелага ад брэжнеўскіх рэпрэсій.**

Тагачаснае праскае кіраўніцтва на чале з прэзыдэнтам Новатным або ігнаравала выклікі часу, або абмяжоўвалася паўмерамі. У краіне ўзрастала незадаволенасьць. Яе рупарам выступалі вядомыя пісьменьнікі: Вацлаў Гавал, Павал Когут, Мілан Кундэра і інш. Пачаліся студэнцкія хваляваньні і рабочыя страйкі. Спробы ўлады задушыць іх сілай толькі абвастрылі становішча. Узьнікла думка замяніць непапулярнага Новатнага на менш адыёзную фігуру. Прымальнай кандыдатурай уяўляўся Аляксандар Дубчак — удзельнік славацкага камуністычнага паўстаньня, выхаванец савецкай партыйнай школы. У Брэжнева і іншых маскоўскіх правадыроў былі падставы думаць, што «Саша» — свой чалавек, і яны далі згоду на замену ў студзені 1968 г. Новатнага Дубчакам. Гэта і стала пачаткам «Праскай вясны».

Новае кіраўніцтва не было маналітным, яно ўключала як прыхільнікаў рэформаў (Ота Шык, Здэнэк Млынарж, Францішак Крыгель), так і кансэрватараў (Васіл Біляк, Алоіс Індра, Густаў Гусак), якія больш за ўсё баяліся гневу Масквы. Тым ня менш, краіна закіпела. Зьявілася нечуваная з 1948 г. свабода друку, сталі ўзьнікаць рознага кшталту нефармальныя аб'яднаньні. Пачалося расьсьледаваньне палітычных рэпрэсій. Гэта выклікала занепакоенасьць у суседзяў.

Пятро Машэраў баяўся абуджэньня братоў-славянаў, а другі беларускі кіраўнік, Кірыла Мазураў, езьдзіў у Прагу з шпіёнскай місіяй.

Першымі аб пагрозе сацыялізму ў Чэхаславаччыне загаварылі Ульбрыхт у ГДР, Гамулка ў Польшчы, Пётар Шэлест ва Ўкраіне (украінцы Прашаўшчыны, Славаччыны сталі масава публікаваць забароненыя ў Саюзе тэксты, і яны траплялі за савецкую мяжу).

Амэрыканскі дасьледчык чэскага паходжаньня Іржы Валента адносіць да лягеру праціўнікаў «праскай вясны» і Пятра Машэрава, які таксама баяўся абуджэньня братоў-славянаў, імпульсы якога непазьбежна далятаці і б да паняволеных народаў СССР. На ягоную думку, кіраўнікі савецкіх рэспублік не былі зацікаўленыя ў пашырэньні ідэі фэдэралізму і лібэралізму, а хацелі толькі ільготаў ад Масквы.

Другі беларускі кіраўнік, Кірыла Мазураў, езьдзіў у Прагу з шпіёнскай місіяй. Ён выдаваў сябе за пацярпелага ад Брэжнева, а на самай справе зьяўляўся досыць актыўным сталіністам.

На гэтым фоне пазыцыя Брэжнева выглядала спачатку як памяркоўная, ён быў у прыяцельскіх стасунках з Дубчакам. Але Прага пачала аспрэчваць прапанаваную Масквой дактрыну аб абмежаваным сувэрэнітэце сацыялістычных краінаў. Пачала выказваць свае пярэчаньні і Вугоршчына. Румынія, Югаславія, Альбанія ўвогуле адмовіліся абмяркоўваць савецкія ініцыятывы. Гэтага Леанід Ільіч дараваць ужо ня мог. Неслухаў трэба было караць. У ноч з 20 на 21 жніўня войскі Варшаўскае дамовы былі ўведзеныя ў братнюю Чэхаславаччыну. Краіна не была гатовая да абароны. Войска было цалкам пад савецкім кантролем. Палітычнае кіраўніцтва таксама не хацела разрыву з краінай Саветаў. Тым ня менш, адразу ж Дубчак і ягоныя найбліжэйшыя паплечнікі былі арыштаваныя і інтэрнаваныя на савецкую тэрыторыю. Пасьля доўгіх і прыніжальных перамоваў у Крамлі прадстаўнікі Чэхаславаччыны вымушаныя былі пагадзіцца з усімі патрабаваньнямі цэнтру.

Неўзабаве Дубчак быў заменены на вернага СССР Густава Гусака. Пачаўся пэрыяд так званай «нармалізацыі», скіраванай на дыскрэдытацыю і забыцьцё самой ідэі рэформаў. «Праская вясна» была абвешчаная «ціхай контррэвалюцыяй», падкопамі сусьветнага сіянізму. У Беларусі на гэтай ніве асабліва шчыраваў сумнавядомы прапагандыст Уладзімер Бягун (якога за вочы называлі «Валодзька Брахун»). Аднак дзеяньні партыі і ўраду выклікалі на гэты раз пратэст у самім Савецкім Саюзе. На Краснай плошчы прайшла дэманстрацыя пад лёзунгам «За нашу і вашу свабоду». Трэба згадаць, найперш, Міхаіла Кукабаку, «ці не адзінага жыхара БССР, які адкрыта пратэставаў супраць агрэсіі ў Чэхаславаччыну» (Уладзімер Арлоў). Аб Кукабаку рабіў даклад у амэрыканскім Сэнаце Робэрт Кенэдзі — брат прэзыдэнта Джона Кенэдзі.

Аднак галоўныя жарсьці разыграліся ў Празе. У наступным годзе пасьля ўварваньня студэнт Ян Палаха ўчыніў акт самаспаленьня, каб узьняць супраціў у краіне. У 1977 г. дзеячы «Праскай вясны» ўклалі так званую «Хартыю-77», дзе заклікалі ўладу да шанаваньня правоў чалавека ў адпаведнасьці з Хэльсынскімі пагадненьнямі аб супрацоўніцтве і бясьпецы ў Эўропе. Трэба сказаць, што падпісантаў «Хартыі» было няшмат, асабліва ў Славаччыне. Менавіта славацкія камуністы складалі аснову рэжыму «нармалізацыі», менавіта пры іх Славаччына нарэшце атрымала статус фэдэратыўнай рэспублікі. Таму Маскву дысыдэнцкі рух у Чэхаславаччыне ня вельмі хваляваў. Толькі калі пачалася аксамітная рэвалюцыя, Крэмль прызнаў увядзеньне войскаў памылкай, але было ўжо позна.

Як цяпер, праз сорак гадоў, ацаніць спадчыну «Праскай вясны»? Яе лідэры былі камуністамі, іх мэтай было рэфармаваньне і захаваньне сацыялізму. Сёньня мала хто верыць у гэтую ідэю. Перабудова ў СССР яшчэ раз прадэманстравала банкруцтва «сацыялізму з чалавечым тварам». Што ж засталося? Застаўся прыклад супраціву, маральнай перамогі слабага над дужым, безабароннай краіны над мілітарызаванай імпэрыяй.


**1968. На вуліцах Прагі.**

# Амэрыканскі дэльфін



У сераду ў Пэкіне з новым сусьветным рэкордам на двухсотмэтроўцы батэрфляем перамог 23-гадовы амэрыканскі плывец Майкл Фэлпс. Тым самым атлет увайшоў у гісторыю Алімпійскага руху. Яшчэ ніхто да яго не станавіўся адзінаццаціразовым пераможцам Гульняў.

А яшчэ Фэлпс 17 разоў падымаўся на найвышэйшую прыступку спаборніцтваў за першынство плянэты, а сусьветныя рэкорды на розных дыстанцыях усталёўваў ажно 30 разоў. Пра такіх спартоўцаў прынята гаварыць «Чалавек-легенда».

У басэйн Фэлпс пайшоў па прыкладзе сваіх старэйшых сёстраў (ён трэцяе дзіця ў сям'і). Ягоныя ўнікальныя дадзеныя амаль адразу заўважыў дасьведчаны спэцыяліст Боб Боўмэн, якому толькі заставалася шліфаваць гэты талент.

Майкл мае ідэальнае для плыўца цела — ён пляскаты і шырокі, нібыта тая рыба камбала. За гэта плыўца часта так і называюць. А яшчэ яго называюць «Амэрыканскім дэльфінам» і «Балтыморскай куляй». На целе амэрыканца няма ні граму лішняга тлушчу. Мышцы таксама ня робяць асаблівага ўражаньня сваёй магутнасьцю. Але яны надзва эластычныя і хутка ўзнаўляюцца.

Першы старт Фэлпса на Алімпіядах адбыўся ў 2000 г. у Сыднэі, калі плыўцу было ўсяго 15 гадоў. Ён стаў самым маладым амэрыканцам, якому выпала выйсьці на блакітныя дарожкі Гульняў за апошнія 68 гадоў. Там падлетак ня выйграў ніводнага мэдаля. Але здолеў узысьці на пятае месца.

Многія дзівіліся, навошта пацан выходзіць у Аўстраліі на тры старты ў дзень, ня маючы ніякіх шанцаў на посьпех. «Гэта альбо ідыёт, які не разумее, што ён робіць, альбо геній, які мае свой абсалютна неймаверны плян», — пісалі пра Фэлпса вядучыя выданьні сьвету.

І ўжо праз тры гады на чэмпіянаце сьвету ў Барсэлёне Фэлпс бліскуча абверг меркаваньні ўсіх скептыкаў. Ураджэнец Балтымору заваяваў тры залатыя мэдалі мундыялю, выклікаўшы павагу калегаў і спэцыялістаў.

А яшчэ ён запомніўся ў сталіцы Каталёніі неардынарным учынкам: прайграўшы спрэчку трэнэру, стаў галіць галаву пад нуль проста ля борціка басэйну, дастаўшы станок, крэм, нажніцы, пенку.

Яшчэ праз год на Алімпіядзе ў Афінах Майкл Фэлпс выйграў ажно шэсьць залатых мэдалёў. У Пэкіне — ужо пяць.

У дзяцінстве Майкл пакутаваў ад досыць рэдкай хваробы — парушэньне разьвіцьця. Хлопец ня мог канцэнтраваць сваю ўвагу і рэдка нешта запамінаў, але гэта ўсё межавала з гіпэрактыўнасьцю. Напрыклад, хлопцу прапаноўвалася прабегчы стомэтроўку і выйграць нейкую шакалядку ці чупа-чупс. Майкл перамагаў усіх без асаблівых цяжкасьцяў, але цалкам забываўся на прыз. Зрэшты, цяпер Фэлпс дакладна ведае дзеля чаго ён плавае.

Фэлпс мала чым розьніцца ад сваіх амэрыканскіх аднагодкаў — трушчыць поп-корн, не здымае навушнікаў з музыкай любімага Эмінэма, а на ўсе старты цягае сьмешны талісман у выглядзе бляшанкі кансэрваваных малюскаў. Такі ён — новы спартовы ідал чалавецтва.

**Зьміцер Панкавец**

### 300 параў пабраліся шлюбам у дзень трох васьмёрак

У «дзень трох васьмёрак» — 08.08.08 — у менскіх ЗАГСах пабраліся шлюбам каля 300 параў. Усе маладыя, якія абралі для такога адказнага кроку гэты дзень, перакананыя, што ён абяцае ім доўгае і шчасьлівае жыцьцё.

### У Гомелі — крадзеж году

7 жніўня між 14.00 і 14.30 нехта, падабраўшы ключ ад абменнага пункту філіялу банку «Залаты талер», патрапіў туды і забраў 8725 даляраў, 1195 эўра, 70 210 расейскіх і 9 мільёнаў 317 тысячаў беларускіх рублёў, а таксама 300 украінскіх грыўняў. Як выявілася, абменны пункт ня быў абсталяваны ні ахоўнай сыгналізацыяй, ні сыстэмай відэаназіраньня.

### У Менску будаўніка забіла блёкам

На будоўлі жылога дому па вул.Цімашэнкі ў Менску атрымаў сьмяротную траўму 25-гадовы рабочы. На яго з вышыні зваліўся газасылікатны блёк.

### У ЗША выкрылі беларускага хакера

Група хакераў узламала кампутарныя сыстэмы буйных сеткавых крамаў і выкрала дадзеныя з 41 млн плацёжных картаў. Гэта найбуйнейшы крадзеж асабістых дадзеных у гісторыі ЗША. Хакераў было адзінаццаць — беларус, тры амэрыканцы, тры ўкраінцы, два кітайцы і эстонец. Імя і нацыянальнасьць адзінаццатага ўдзельніка не называецца.

### Зьявілася праваслаўнае марозіва «Пушок»

На абгортцы значыцца: «вырабляецца па Дабраславеньні Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Высокапраасьвяшчэньнейшага Мітрапаліта Менскага і Слуцкага ФІЛАРЭТА». Прадукт з выявай белага пушыстага ката выраблягае мясцовы камбінат «Малочны сьвет». Чаму менавіта дзеля Пушка ўладыка Філарэт выдаў сваё дабраславеньне? На прадпрыемстве кажуць: гэтак клічуць ката дырэктара.

### Вучань пакусаў міліцыянта

У Карме на Гомельшчыне навучэнец Краснабярэскага каледжу пакусаў вартаўніка парадку. Хлопцы нешта ўсхадзіліся позна ўначы, і міліцыянт маніўся іх утаймаваць. Тады адзін з буяноў пірхнуў яму ў твар ды шчэ ўкусіў за локвіцу. Пацярпеламу ахоўніку парадку дапамаглі лекары, а супраць кусьліўца ўсчалі крымінальную справу паводле артыкулу «Гвалт альбо пагроза ўжыцьця гвалту да работніка міліцыі», паведамляе «Беларуская ніва».

### Бабулі блукаюць у лясах

Пайшла 78-гадовая бабуля ў грыбы яшчэ 5 жніўня, і дадому не вярнулася. Жыхарку пасёлку Капцэвічы Петрыкаўскага раёну шукаюць 29 міліцыянтаў, лесьнікоў і вяскоўцаў, але пакуль безвынікова.

А вось у Вялейскім раёне бабулька праседзела ў лесе пяць дзён бязь ежы, але ўрэшце яе адшукалі. Старыя людзі, бывае, губляюць арыентацыю нават у знаёмых лясах.

### Таўстуны могуць быць цалкам здаровымі

Новыя дасьледаваньні паказалі, што прыблізна ў паловы тоўстых людзей назіраецца нармальны ціск і ўзровень халестэрыну. А ў худых людзей часта праяўляюцца хваробы, да якіх звычайна схільныя людзі з залішняй вагой. У 51% дасьледаваных таўстуноў узровень халестэрыну й крывяны ціск адпавядаюць норме.

### У Францыі 10-гадоваму матадору не даюць выступаць

Улады гораду Арль на поўдні Францыі забаранілі выступаць 10-гадоваму матадору, які стаўся зоркай карыды ў Мэксыцы. Мішэль Лагравэрэ Пэнічэ, які атрымаў мянушку «Міхэліта», выступае з шасьці гадоў і за гэты час забіў 60 маладых быкоў. Прадстаўнікі арганізацыі, якая выступае супраць правядзеньня карыды, раскрытыкавалі ўдзел дзіцяці ў гэтакіх прадстаўленьнях. У якасьці афіцыйнай прычыны адмены імпрэзы былі названыя меркаваньні бясьпекі. Сам Міхэліта быў расчараваны.

### Польска-нямецкая нудысцкая вайна

Каталіцкая грамадзкасьць гораду Сьвіноўсьце, што каля нямецкай мяжы, абураная тым, што немцы на пляжы, які знаходзіцца побач з горадам, загараюць і купаюцца голыя. Раней, калі Польшча не была ў Шэнгенскай зоне, пляж падзяляла сетка. Немцы таксама незадаволеныя паводзінамі палякаў. «Гэта пляж для нудыстаў. А палякі прыходзяць апранутыя, сядаюць і вылупляюцца на голых людзей», — кажа адзін нямецкі нудыст. «Адчуваем сябе як малпы ў заапарку», — дадае другі.

### Чаму людзі купляюць лятарэю

Дзяржаўныя лятарэі вяртаюць у выглядзе выйгрышу ў сярэднім толькі 53 цэнты з кожнага даляра, выдаткаванага людзьмі на білеты, адзначаюць навукоўцы. Чаму людзі ідуць на рызыку? Амэрыканскія дасьледчыкі «рэкрутавалі» добраахвотнікаў на аўтобуснай станцыі ды папрасілі іх запоўніць анкеты. Прычым людзей падзялілі на дзьве групы. Першай давалі анкеты з пытаньнем «Ваш гадавы прыбытак?» і варыянтамі «ад $100 да 200 тысячаў», «ад $200 да 300 тысячаў» і гэтак далей. У другой групы на тое ж пытаньне варыянты адказаў былі такімі: «менш за $10 тысячаў», «ад $10 да 20 тысячаў», «ад $20 да 30 тысячаў», «ад $30 да 40 тысячаў». Адпаведна паддосьледных зь першай групы навукоўцы прымусілі псыхалягічна адчуваць сябе беднымі, а другой — багатымі.

Далей кожнаму давалі па $5 (нібыта за дапамогу ў апытаньні) і прапаноўвалі купіць лятарэйныя білеты. «Бедныя» накупілі ў сярэднім 1,27 білетаў на чалавека, а «багацейшыя» — 0,67.

Далей досьледы ўскладнілі. Дасьледчыкі ўскосна нагадвалі паддосьледным, што хоць людзі з рознымі ўзроўнямі прыбыткаў маюць розныя магчымасьці ў пляне адукацыі, працы й жыльля, у лятарэі ўсе шанцы аднолькавыя. Пасьля такой «падказкі» група паддосьледных купляла ўдвая болей білетаў за групу, якой такіх напамінаў не рабілі.

Выходзіць, беднасьць штурхае людзей купляць лятарэю. Людзі спадзяюцца здабыць грошай, хоць на справе заўсёдная гульня толькі пагаршае становішча.

**Паводле МБ, АК, «Звязда», «Эўрарадыё», BBC, «КоммерсантЪ», BulletinOnline.org**




**Юнак вывозіць збуцьвелыя крыжы зь Сьвятой гары Грабаркі (Падляшша). На сьвята Перамяненьня Гасподняга на гары зьбіраюцца паломнікі з усяго сьвету. Кожны зь іх паводле традыцыі прыносіць на гару свой крыж. Перад вялікім фэстам гару парадкуе моладзь з навакольных вёсак.**

## КАНЦЭРТЫ

### Прысьвячэньне Дэкстару Гордану

**17 жніўня ў Палацы рэспублікі а 19-й** — вечар джазавага саксафону «Прысьвячэньне Дэкстару Гордану».

### Блюз з Нью-Ёрку

**26 жніўня ў ДК Прафсаюзаў** выступае джазавы арганіст Джорж Коліган і ягонае трыё з праграмай «Блюз з Нью-Ёрку». **Пачатак а 19-й.**

## ФЭСТЫВАЛІ

### Старажытны Мсьціслаў запрашае

**15-17 жніўня Мсціслаў** запрашае на фэстываль сярэднявечнай культуры «Рыцарскі фэст. Мсьціслаў — 2008». Мэта фэстывалю — праз стварэньне атмасфэры сярэднявечнага сьвята спрыяць адраджэньню старадаўніх традыцый і духоўнасьці ва ўсходняй Беларусі, папулярызацыі зацікаўленасьці да рыцарскай культуры, фольк-напрамку ў музыцы, старадаўняга танца, народных рамесваў. Акрамя рыцарскай часткі, фэстываль мае наступныя элементы рэканструкцыі сярэднявечнай культуры: музыка — ад розных апрацовак фольку да музыкі палацаў і замкаў; старадаўнія танцы, гістарычны тэатар, майстар-класы народных рамесваў і выставы. У межах фэсту адбудзецца дзіцячая канцэртна-гульнявая праграма «Мсьціслаўляндыя запрашае» і тэатралізаваная пастаноўка легенды «Сказ пра гару «Плачу». Скончыцца сьвята 17 жніўня тэатралізаваным штурмам замка і бугуртамі — бойкамі рыцарскіх клюбаў.

**Юрась Каласоўскі**

### Князю Канстанціну

**9 жніўня**, у першы дзень сьвята Супрасьльскай іконы Багародзіцы, у дзядзінцы Супрасьльскай лаўры, была пачалася выстава, прысвечаная князю Канстанціну Васілю Астрожскаму, 400-годзьдзе сьмеці якога мінае сёлета, і ўсталяваная выкананая ў беларускіх майстэрнях мэмарыяльная дошка яму. На выставе сорак выяваў, прысьвечаных роду Астроскіх.

**Паводле газэты «Ніва», Беласток**

### Be2gether

**14—17 жніўня за 50 мэтраў ад беларускай мяжы на тэрыторыі Літвы** пройдзе фэстываль Be2gether. Беларусь на ім прадстаўяць гурты **N.R.M.**, **Mauzer** і **Osimira**. Агулам сёлета на Be2gether выступіць болей 75 гуртоў з усяго сьвету. Рок-фэст на беларуска-літоўскай мяжы Be2gether адбудзецца ў другі раз. Гэтым разам ён пройдзе ажно на трох сцэнах. Арганізатары сёлета не выстаўляюць аніякіх палітычных лёзунгаў і прысьвячаюць фэст Вільні. Be2gether'2008 распачнецца 14 жніўня каля Віленскай ратушы. Для ўсіх прысутных прагучыць адмысловая барабанная сюіта, якая мае стаць нечым накшталт афіцыйнага гімну фэстывалю. На фэсьце Be2gether 6 гектараў зойме прастора для творчасьці і забаваў. Будзе заснаваны парк гукавых скульптураў, абсталяваная пляцоўка, прысьвечаная The Beatles, а таксама дыскатэка ў брудзе і іншае.

## ВЫСТАВЫ

### Польская правінцыя ў Менску

**У галерэі «Сьвет фота» (Прытыцкага, 10)** праходзіць выстава Ежы Пёнтэка «Сума і зачараваньне правінцыі». Чорна-белыя фатаграфіі, кранальная ўвага аўтара да сваіх пэрсанажаў, надзвычай мінулае, у якім можна разгледзець і цяперашняе. Польская глыбінка 30—40-х прадстаўленая на выставе «Сум і зачараваньне правінцыі» такой, якой яе пабачыў Ежы Пёнтэк. Ня дужа добра апранутыя людзі, несамавітыя жылыя будынкі, недагледжаныя вуліцы, спрацаваныя рукі, выразы твараў без прыкметаў аптымізму — словам, усё, што было не прынята выстаўляць напаказ, што ішло ўразрэз з афіцыйнай ідэалёгіяй, дэманстравала крытычны погляд на рэчаіснасьць таго часу й так нагадвала савецкі побыт. І ў самой Польшчы, і ў Беларусі, расказвае Ежы Пёнтэк, ёсьць яшчэ людзі, якія цяжка расстаюцца з старымі звычкамі, не разумеюць, навошта гэта ўсё паказваць. На адкрыцьці выставы Ежы Пёнтэк падзякаваў усім, хто ўдзельнічаў у падрыхтоўцы экспазыцыі й асобны дзякуй сказаў Польскаму інстытуту, які, паводле слоў фатографа, «яшчэ 10 гадоў таму ня ўдзельнічаў бы ў выставе з такімі «дрэннымі» сюжэтамі». У пасольстве Беларусі ў Варшаве таксама не адразу зразумелі, навошта паказваць гэтую фотакалекцыю ў Менску, кажа Ежы Пёнтэк: «Калі я хацеў атрымаць беларускую візу, я два разы размаўляў з консулам у Варшаве, з прэс-сакратаром, з чалавекам, адказным за культурнае супрацоўніцтва. Я зрабіў памылку, напэўна, я паказаў альбом. Мае сябры атрымалі візу хутка, а ў мяне праблемы». Візу, урэшце Ежы Пёнтэк атрымаў. І нават дамовіўся з прадстаўніком беларускага пасольства ў Варшаве пра тое, каб у 2009 годзе правесьці выставу разам з фатографамі зь Беларусі. Фатаграфіі, якія ўвайшлі ў экспазыцыю, зробленыя ў Келецкім ваяводзтве, якое лічыцца адным з самых бедных у Польшчы. Ежы Пёнтэк узнаўляе атмасфэру нядаўняга мінулага.

**Паводле Deutsche Welle**

### Горадня — Парыж

Ціхае гарадзенскае лета ўскалыхнула фотамастачка Натальля Ракіцкая-Жамар, гарадзенка, якая жыве цяпер у Францыі. **На вуліцы Ажэшкі**, побач з выставачнай залай сёньня прыпыняюцца людзі й аглядаюць здымкі на вялікіх вітрынах. Там адкрылася фотавыстава «Горадня — Парыж». Магчыма, нехта пабачыў і сябе. Звычайныя будня дні, людзі проста на вуліцах ці ў нейкіх установах: нехта заняты справай, хтосьці адпачывае ці папросту апынуўся ў той момант перад аб'ектывам. Ва ўсім па два здымкі: адзін з Горадні, другі з Парыжу, і на кожным бачны чалавек. Вось пані ў Парыжы, а вось на Аўгустоўскім канале ў вёсцы Чарток. Аўтарка ня робіць ніякіх высноваў, не ацэньвае, не кваліфікуе, не павучае, а проста паказвае людзей з аднае Эўропы, такіх падобных і розных... Перад адкрыцьцём аўтарка сказала мне, што ўжо не хвалюецца, паколькі прайшла доўгі шлях угару й знайшла пасьля гэтага, што паказаць людзям...

**Радыё «Свабода»**

### Залаты фонд Беларускага саюзу мастакоў

**У Палацы мастацтва да 31 жніўня** працуе выстава «Залаты фонд Беларускага саюзу мастакоў», на якой можна ўбачыць больш за 200 твораў клясыкаў беларускай школы жывапісу. Сярод аўтараў — Віталь Цьвірко, Віктар Грамыка, Леанід Шчамялёў, Мікалай Селяшчук, Гаўрыіл Вашчанка, Аляксандар Кішчанка ды іншыя. Большасьць твораў доўгі час нідзе не экспанавалася.

### NAVINKI-2008

**З 29 да 31 жніўня ў Палацы мастацтва** — Міжнародны фэстываль пэрформансу NAVINKI-2008 з удзелам масткоў-артыстаў Нямеччыны, Японіі, Польшчы, Сінгапуру, Швэцыі, Швайцарыі, Англельшчыны, ЗША, Аўстраліі і Беларусі.

### Жывапіс Валянціны Сьвентахоўскай

**Да 17 жніўня ў Палацы мастацтва** працуе выстава твораў Валянціны Сьвентахоўскай. Мастак высокага таленту, незвычайнага ўнутранага светаадчуваньня... Вось чаму яе творы прыцягваюць і размаўляюць з намі на зразумелай мове.

### Вера, Надзея, Любоў

**З 20 да 31 жніўня ў Палацы мастацтваў** — вэрнісаж юбілейнай выставы Любові Кірылавай і Веры Блінцовай «Вера, Надзея, Любоў».

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Антыўтопія па-французску

**«Мяжа(ы)»** (Frontière(s))

**Францыя, 2008, каляровы**

Рэжысёр Ксаўе Ганс

З аглядкі на летняе бязрыб'е ў кінатэатрах, прапаную вашай увазе карціну, што нядаўна зьявілася ў продажы на дысках. «Мяжа(ы)» — гэта палітычнае пасланьне, запакаванае ў форму крывавай «мясной» стужкі.

Юнакі-бандыты з арабскіх прыгарадаў дый цяжарная гераіня ўцякаюць з Парыжу, дзе на выбарах перамагае ўльтраправы кандыдат. Але перасячы бэльгійскую мяжу не атрымаецца: героі загасьцююць у сям'і канібалаў на чале зь недабітым эсэсаўцам.

Кроў у карціне, спрадусаванай Люкам Бэсонам, ліецца вёдрамі. Вішчыць цыркулярная піла й рохкаюць сьвіньні, б'юцца ў хлеве недарэкі, пакінутыя для ежы і для расплоду, сэнтымэнтальная дурніца пераразае горла ахвяры.

Але стужка на сьмецьцевы сюжэт пастаўленая зь неймавернай сур'ёзнасьцю, ад якой сапраўды робіцца млосна. Ультраправы кандыдат — амаль копія Саркозі, які на хвалі беспарадкаў прыйшоў у Францыі да ўлады. Галодны эсэсавец мусіць сымбалізаваць пераемнасьць правых ідэяў, а няшчасныя ахвяры — народны бунт, які завяршаецца абавязковым канібалізмам.

Жорсткае палітычнае пасланьне пазбаўляе карціну свабоды й робіць стужку невыноснай і цяжкой. Французы зьляканыя мінулымі пагромамі, але прышлага баяцца яшчэ болей.

**Андрэй Расінскі**




**Сыгнал незалежнага беларускамоўнага спадарожнікавага тэлеканалу цяпер даступны праз спадарожнік «Сырыюс-4». Адначасова «Белсат» застаецца на спадарожніку «Астра».**

**Парамэтры каналу на «Сырыюсе»: Пазыцыя 5° E, Палярызацыя H, Частата 12 379,6 МГЦ**

# Парады для лорда Бэла

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Вельмі прыкалола навіна пра тое, што брытанскі рыцар лорд Бэл падпісаў кантракт зь Беларусьсю ў якасьці піяр-мэнэджара рэжыму. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Перш за ўсё трэба адзначыць, што выбар на карысьць брытанца — гэта ацэнка прафэсійнай здольнасьці Азаронка, Казіяткі і іншых айчынных прапагандыстаў. Будзе файна, калі ангелец атрымае вялікія паўнамоцтвы і пачне, апрача іншага, сунуць нос у творчы працэс на БТ:

«Ведаеце што, містэр Азаронак, — скажа Бэл, неяк сутыкнуўшыся з аўтарам «Дзяцей хлусьні» каля ліфта на Макаёнка, — паглядзеў я ўчора ваш чарговы прагон... Што магу сказаць — тэма сувязі акцый апазыцыі з працэсамі глябальнага пацяпленьня цікавая, аднак адстойная. Такімі фільмамі пазытыўны імідж Бацьку ня створыш. Затое на Захадзе вельмі ўплывовыя асацыяцыі геяў, якія маюць палітычнае лобі, шырока прадстаўленыя ў прэсе. Дык вось я тут падумаў: ці не даручыць вам здымкі фільму пра разгул свабоды гомасэксуалістаў у РБ і пра тое, як улады цацкаюцца зь імі. Прыступайце зараз жа. Я ўжо тэлефанаваў у БРСМ: яны дадуць разнарадку на сельскагаспадарчую акадэмію па вывадзе студэнтаў на гей-парад».

Аднак вернемся да справы.

Важны блёк у рэформе іміджу рэжыму: устойлівая клікуха «апошні дыктатар Эўропы» мае трансфармавацца ў новы, больш прывабны для вуха псэўданім. Напрыклад, Жалезны мужык або Жалезны лыжнік (калі праводзіць аналёгіі з Жалезнай лэдзі — папярэдняй працадаўцай лорда Бэла).

Цікава, якую вэрсію новай мянушкі для раскруткі абярэ брытанец?

А ці будзе ён узгадняць свой варыянт з афіцыйным Менскам?

Бачу ашалелыя вочы намесьніка старшыні Адміністрацыі, чалавека савецкай школы, Рубінава, якому госьць з Альбіёну падсоўвае нейкія варыянты мянушак. Асабліва калі сярод прапановаў — назвы зоамарфалягічнага паходжаньня (шмат каго з палітыкаў параўноўвалі з тым ці іншым зьверам — напрыклад, Чэрчыля за вочы называлі «хітрым лісам», а Пуанкарэ — «тыграм»).

Мне думаецца, што трэба танцаваць ад старой назвы.

На базе выразу пра дыктатара трэба стварыць і раскруціць абрэвіятуру — на інгліішы гэта будзе LDE (Last Dictator of Europe).

Другі крок: LDE, калі чытаць проста — Элдзі. Тут пачынаецца самае важнае. Элдзі гучыць таксама, як Aldi — самая буйная сетка супэрмаркетаў у Эўропе.

Асацыяцыя зь сеткай танных супэрмаркетаў адразу рэабілітуе нашыя заскокі наконт правоў чалавека.

Уявім сабе.

Сярэдні брытанец пасьля працы сядзіць перад тэлекам і гуляецца з пультам.

Клік.

BBC 1. Голас з рэклямы: «Элдзі зноў паніжае цэны на кетчуп!»

Клік.

BBC 3. Вядоўца шоў: «Працягваем трансьляцыю са спаборніцтва сярод хатніх гаспадынь па заплыве ў стылі батэрфляй на прыз ад Элдзі — тону вэрмішэлі хуткага гатаваньня!»

Клік.

BBC 4. Голас з рэклямы: «Элдзі прапануе цікавую і пэрспэктыўную працу для маладых людзей — рэклямаваць новы корм для катоў, якія перажылі дэпрэсію пасьля правалу «Манчэстэр Юнайтэд» у Кубку чэмпіёнаў».

Клік.

BBC 2. (нудны-нудны канал для інтэлектуалаў): Нудны аналітык у акулярах: «Алярм! Элдзі перасьледуе апазыцыю! Куды глядзіць Эўропа? SOS!»

Клік.

Лічыце, што пазытыўны імідж Элдзі на Захадзе ў кішэні. Натуральна, з часам можа ўзьнікнуць пытаньне: чаму Элдзі? А хто ведае адказ лепей за галоўнага піяр-прадстаўніка Менску.

Званок у офіс лорда.

«Так, лорд Бэл слухае. Чаму яго называюць Элдзі? Гэта ад абрэвіятуры ЛДІ, якую ў народзе расшыфроўваюць як «лепшы друг інтэрнэту». Хаця сярод часткі беларусазнаўцаў ёсьць іншая вэрсія: абрэвіятура пайшла ад папулярнага ніку, які яму даў піпл — «Last Democrat of Europe».

## КАЛІ Б...

**...«змушэньне да міру» было алімпійскім відам спорту.**

**Зэўс** (кіраўнік алімпійскіх багоў): Дрэнная навіна для вас, Гітлер. Ваш рэкорд у катэгорыі «змушэньне да міру», усталяваны ў Польшчы ў 1939-м, пабіты.



МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ПАКОЙ

**Шукаю** пакой на доўгі час. Працую. Бяз шкодных звычак. Т.: (029) 733-25-30

### КАНТАКТЫ

**Штосуботу** беларускамоўная грамада зьбіраецца піць піва ад 18 гадзіны ў піўбары «Аліварыя», што на вуліцы Багдановіча

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101-03-24. Юрась

**Якасны набор**, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101-03-24. Юрась

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Магілёўская суполка ТБМ** імя Францішка Скарыны 16 жніўня ладзіць аднадзённую вандроўку па маршруце Магілёў—Сухары—Расна—Пустынкі—Мсьціслаў – Магілёў. У межах падарожжа заплянаванае наведванне Ўсьпенскай царквы ў в. Сухары, руінаў касьцёла сьв. Казіміра і сядзібы ў в. Расна, Усьпенскага манастыра ў Пустынках, рыцарскага турніру і канцэрта сярэднявечнай музыкі ў Мсьціславе. Даведкі праз тэлефоны: (029) 388-35-61, (029) 245-64-52 (Алег).

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**З Каўказу**. Ня так даўно каўкаскі ваенна-акружны суд разьбіраў справу аб «*рэспубліцэ ў Сочы*»; абвіняемых было 109 чалавек, а сьведкаў на суд паклікалі блізка 700.

Як відаць з «абвініцельнага акту», пасьля маніфэсту 17 акцябра рэвалюцыйныя партыі хацелі завесьці тут новыя парадкі, аддаць усю ўладу ў рукі самога народу, устанавіць «рэспубліку». Усімі справамі гораду і «рэспублікі» заведаваў *Сэйм Народны* (свая Дума). Гэты Сэйм завёў народную міліцыю — якбы сваё войска, каторае было прызначаная для начной ахраны. Жыцелям былі дадзены роўныя правы і поўная свабода.

Начальства старое глядзела на ўсё гэта і нічога перашкодзіць не магло: яно мела пад сваёй камандай усяго 23 салдатаў і 70 стражнікаў. А тым часам рэвалюцыянэры дасталі некалькі сотняў вінтовак са штыкамі, і народная міліцыя (войска) мела вялікую сілу. І вось, у студні 1906 г., як стражнікі, каторыя стаялі за старое начальства, хацелі арыштаваць некалькі рэвалюцыянэраў, паднялося праўдзівае паўстаньне. Народнае войска напала на казённых салдатаў і стражнікаў, а як тыя схаваліся ў лягеры і сталі бараніцца, дык рэвалюцыянэры акружылі іх і пачалі абстрэльваць зь вінтовак і нейкай старой гарматы.

На чацьвёрты дзень правіцельства прыслала больш войска і ваенны карабель (контр-мінаноску). Тады рэвалюцыянэры, убачыўшы, што проці вялікай сілы нічога зрабіць ня здалеюць, самі кінулі бунтавацца і споўнілі ўсё, чаго начальства ад іх зажадала.

Новыя парадкі скончыліс: усё ізноў было заведзена, як даўней.

**«Наша Ніва». № 15. 1908**

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту,**

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 12 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

## Дзякуй!

**Віктару Н.** з Пухавіцкага раёну.
**Вользе А.** зь Любанскага раёну.
**В.К.** з Полацку.
**Анатолю Б.** з Магілёва.
**Аляксандру К.** са Слуцкага раёну.
**Уладзімеру Х.** з Шаркаўшчынскага раёну.
**Генадзю П., Анатолю Л.** з Гомелю.
**Мікалаю К.** з Лунінецкага раёну.
**Сяргею С., Ганьне П.** зь Віцебску.
**Сяргею Ц.** з Докшыцкага раёну.
**Мікалаю К.** з Валожынскага раёну.
**Сяргею І.** зь Берасьця

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 13.08.2008.

Замова № 4422.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.